ЛІТАРАТУРА і мастацтва



1 ліпеня 2005 г. № 26/4313

ДЗЕНЬ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Радзіма мая дарагая,
Ты ў шчасці жаданым жыві:
Я сэрцам табе прысягаю
У шчырай сыноўняй любві.

На рэках, азёрах і нівах,
Заводах, будоўлях — наўсцяж
Народ наш працуе руплівы,
І край узвышаецца наш...

Алесь БАЧЫЛА

Фота К. Дробава, В. КАВАЛЁВА
Калаж В. КАЛІНІНА

Тут Радзімы маёй пачатак

Перад Днём Незалежнасці Рэспублікі Беларусь у дзіцячых бібліятэках сталіцы праходзяць гутаркі і выставы, прысвечаныя сімвалам краіны гербу і сцягу, а таксама сённяшняму дню суверэннай рэспублікі.

Так, юныя грамадзяне, якія наведваюць Цэнтральную дзіцячую бібліятэку, азнаёміліся з кніжнай выставай «Тут Радзімы маёй пачатак», пасля чаго сталі ўдзельнікамі гутаркі «Непаўторная Белая Русь».

Кніжную выставу «Ад Мінска да Берліна» прапанавалі сваім маленькім чытачам супрацоўнікі дзіцячай бібліятэкі № 15. На паліцах бібліятэкі № 5 размясціліся... «Старонкі вызвалення Мінска». Адбыліся «круглы стол» «Не згасне зорка памяці» з удзелам гарадскога савета ветэранаў, прэзентацыя фотаздымкаў «Час велічы і славы», а таксама тэматычная інтэлектуальная гульня «Часоў былых і новых сувязь».

Выставай і аглядам кніг «Я перад памяццю сваёй...» парадавалі сваіх наведвальнікаў у філіяле дзіцячай бібліятэкі № 8. А ў самой бібліятэцы адбылася цікавая гутарка пад назвай «З той далёкай пары мы святкуем штогод трэці ліпеня дзень — святы дзень вызвалення».

Нераўнадушнай атрымалася сустрэча з кіраўніком пошукавай групы З. Ф. Мароз у дзіцячай бібліятэцы № 6, якая мела назву «І будуць памятаць уратаваныя пакаленні».

«Мы робім усё магчымае, каб так і было», — падкрэсліла загадчыца аддзела Цэнтральнай дзіцячай бібліятэкі Лідзія Макаранка. Верыцца, што не толькі ў святы.

Іна ЛАЗАРАВА

У пераможным 1945-м

Менавіта такую назву мае выстава, якая працуе ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі. Гэта сумесны праект самога музея, Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі.

Прадстаўленыя ў экспазіцыі дакументы распавядаюць як святкаваўся у Мінску першы Дзень Перамогі, 3-га ліпеня 1945 года, а таксама пра падрыхтоўку і правядзенне параду пераможцаў, што адбыўся на плошчы Леніна перад Домам урада ў верасні 45-га.

Трэба было адбудоўваць гарады, вёскі, адраджаць прамысловасць і сельскую гаспадарку. Экспанаты выставы якраз і даюць уяўленне аб усім гэтым, — зазначае намеснік дырэктара Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі Ніна Калымага.

Неад'емнай часткай пасляваенных падзей было жахлівае слова «міны». Сапёры не паспявалі спраўляцца з ліквідацыяй «спадчыны» вайны. Значная частка небяспечнай працы выпала на долю юнакоў, якія прайшлі спецыяльныя курсы, з чым і знаёміць адзін са стэндаў.

На выставе можна ўбачыць дакумент, які сведчыць аб тым, што Беларусь стала паўнапраўным суб'ектам міжнародных адносін, адной з краін-заснавальніц Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, статут якой быў ратыфікаваны Прэзідыумам Вярхоўнага Савета БССР 30 жніўня 1945 года.

Усяго каля 70 экспанатаў распавядаюць, як жыла Беларусь у пераможным 1945-м.

Акрамя таго, наведвальнікі музея могуць пазнаёміцца з выставай «Зброя, амуніцыя і час» (ад старажытных часоў да XX стагоддзя), што працуе на пастаяннай аснове. А ў Доме-музеі I з'езда РСДРП, які з'яўляецца філіялам Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі, разгорнута экспазіцыя «Франтавы альбом».

Раіса МАРЧУК

Гісторыя прымірэння

Выстава "Беларускія гастарбайтэры. Гісторыя прымусовай працы і прымірэння" праходзіць у Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны з 10 чэрвеня. Экспазіцыя прысвечана жыхарам нашай краіны, якія былі вывезены ў Германію падчас акупацыі. У ёй прадстаўлены дакументы і аб'ёмныя экспанаты з фондаў самога музея, Нацыянальнага архіва Беларусі і Дзяржаўнага архіва кінафотадакументаў. Яны паведамляюць пра бязлітасную эксплуатацыю, якой падвяргаліся вязні лагераў з боку камандавання нямецкай грамадзянскай адміністрацыі.

Асаблівую ўвагу прываблiваюць лісты зняволеных дадому. У кожным іх радку гучыць глыбокі сум па родных мясцінах. Нельга не заўважыць і дакументаў, якія сведчаць пра нялёгкі пасляваенны лёс вязняў і іх доўгае вяртанне на радзіму.

Падчас выступлення на цырымоніі адкрыцця выставы Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Федэратыўнай Рэспублікі Германія ў Беларусі Марцін Хекер адзначыў, што сённяшнія немцы добра разумеюць свой абавязак перад жыхарамі нашай краіны, якія пацярпелі ад нацыстаў, і робяць усё магчымае для кампенсацыі маральнага і матэрыяльнага ўрону былым вязням. Ён выказаў пажаданне, каб гэтая выстава прайшла не толькі ў Беларусі, але і ў Германіі.

Марына ЦЯРЭШЧАНКА

Наступны нумар газеты выйдзе 15 ліпеня.

«Вянцом» — салют святочны...

Як паведамілі ў Мінгарвыканкаме, напярэдадні Дня Рэспублікі з удзелам Кіраўніка дзяржавы адбылося ўрачыстае адкрыццё гісторыка-культурнага комплексу «Лінія Сталіна».

Там, дзе зусім нядаўна панаваў бур'ян і калючае кустоўе, на 28-ым кіламетры аўтатрасы Мінск—Маладзечна з'явіўся унікальны музей фартыфікацыйных збудаванняў пад адкрытым небам. Па чарцяжах 1940 года падраздзяленні інжынерных войскаў «узрадзілі» акопы. На пазіцыі, як і ў сапраўдным баі, — яжы і супрацьтанкавыя рвы, мінамёты і пушкі...

Гэтая падзея дала пачатак масавым урачыстасцям, прысвечаным Дню Незалежнасці нашай краіны. Сёння ў Дварцы Рэспублікі чакаецца ўрачысты сход і святочны канцэрт, а 3 ліпеня — урачыстае шэсце ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Заўтра на праспекце Пераможцаў пройдзе адкрыты кубак г. Мінска па масавых відах спорту.

Непасрэдна ў Дзень Рэспублікі, позніім вечарам, на Кастрычніцкай плошчы нашай сталіцы адбудзецца маладзёжна-музычнае свята, а да гэтага часу — канцэрт майстроў мастацтваў Мінска: 2 ліпеня — з 19-ці, 3-га — з 12-ці гадзін.

Ужо з сённяшняга дня сталічныя кінатэатры прапануюць да свята творчыя сустрэчы і тэматычныя кінапраграмы. А каля Палаца спорту, у акваторыі ракі Свіслач, пачынаюцца гарадскія спаборніцтвы па парусным спорце. У дзень свята тут «стартуе» 11 Міжнародны лёгкаатлетычны марафон.

Што датычыць юных грамадзян, яны разам з бацькамі могуць адсвяткаваць Дзень Рэспублікі ў Цэнтральным дзіцячым парку імя М. Горкага, дзе для іх будзе разгорнуты рэспубліканскі конкурс-кірмаш «Горад майстроў».

Святочныя гулянні пройдуць па ўсёй краіне. А «вянцом» гэтага знакавага для Беларусі дня стануць салюты.

Інеса ПЕТРУСЕВІЧ

Тэлеэкран пакажа...

З 1 ліпеня на Беларусі пачынаецца новы тэлевізійны сезон. Рэзкіх змен у т.зв. вяшчальнай сетцы не будзе, працэс гэта паступовы і творчы. Але ўжо ў верасні гледачы Першага Нацыянальнага, тэлеканалаў "Лад", АНТ і "Беларусь-ТВ" заўважаць істотнае абнаўленне эфіру, якое завершыцца пры канцы года. А 1 студзеня 2006-га Беларускае тэлебачанне адзначыць свае паўстагоддзя.

Пра тэндэнцыі развіцця нашага самага масавага СМІ, пра новыя праекты юбілейнага вяшчальнага сезона кіраўнікі Белтэлерадыёкампаніі вялі размову на нядаўняй сустрэчы з журналістамі. У бліжэйшы час "ЛіМ" распавядзе пра гэта больш падрабязна.

А пакуль — анонс: на 1-м Нацыянальным тэлеканале завяршаецца маштабны праект, прысвечаны 60-годдзю Перамогі. Унікальнасць яго ў тым, што на БТ былі паказаны ўсе знакавыя мастацкія фільмы пра Вялікую Айчынную, уключаючы такія шэдэўры, як "Ляцяць жураўлі", "Балада пра салдата"; стужкі "Беларусьфільма", у тым ліку створаныя нядаўна "Яшчэ пра вайну", "Вам — заданне". З ліпеня, у Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, у тэлеэфіры адбудзецца прэм'ера найноўшай работы нашай Нацыянальнай кінастудыі — "Глыбокая плынь", знятай паводле твораў Івана Шамякіна.

С.БЕРАСЦЕНЬ

Рэха вайны і памяць сэрца

Такую назву атрымала экспазіцыя, разгорнутая ў Наваполацкай цэнтральнай бібліятэцы імя У.Маякоўскага. На ёй прадстаўлены не толькі кнігі і перыядычныя выданні ваеннага часу, але і прадметы ўжытку — каска і кацялок, маскіровачная сетка, асколкі снарадаў, кулямётная стужка, гармата і іншыя, ля якіх спыняюцца наведвальнікі бібліятэкі: з цікавасцю – маладыя, з сумам у вачах — больш сталага ўзросту.

Але гэта не адзіная экспазіцыя, падрыхтаваная бібліятэкай да 60-годдзя Вялікай Перамогі. У сектары мастацтваў бачым экспазіцыю плакатаў "Вайна. Погляд праз гады" і выставу "Гэты дзень мы набліжалі, як маглі", дзе сваё месца займаюць агітлістоўкі, газеты "Раздавім фашысцкую гадзіну" і "Партызанская дубінка" інш. Як адзначыла галоўны бібліятэкар сектара мастацтваў Лідзія Полазава, гэтыя рэдкія і унікальныя па сваёй сутнасці матэрыялы падаравала бібліятэцы пастаянная чытачка Леаніда Іванаўна Полазава.

Урок мужнасці, праведзены бібліятэкай пад агульным загалоўкам "У цяжкі час вайны суровай" і прысвечаны плакатнаму мастацтву перыяду Вялікай Айчыннай, як бы падагуліў вынікі вялікай работы па захаванні памяці аб загінуўшых і ўдзячнасці тым, хто жыве сёння, хто набліжаў Перамогу.

Валянціна СМАНЦАР
Фота В. КАВАЛЁВА

Адбітак часу і прасторы

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі прайшла прэзентацыя фотаальбома фотамастака Вадзіма Качана "Фотографии прошлых лет" (выдавецтва і друкарня ЗАТ "Юніпак"). На мерапрыемстве прысутнічалі калегі і сябры аўтара, галоўны рэдактар выдавецтва "Юніпак", а таксама прадстаўнікі пасольстваў ды сродкаў масавай інфармацыі, прыхільнікі творчасці фотамастака.

Вадзім Качан — член Беларускага саюза дызайнераў (з 2003 г.), старшыня Беларускага грамадскага аб'яднання "Фотамастацтва" (з 2004 г.). З 1982 па 2005 гады ён удзельнічаў у 47-мі персанальных і групавых выстаўках як на Беларусі, так і па-за яе межамі.

Трэба адзначыць, што гэта першае ў нашай краіне выданне альбома-кнігі, прысвечанага творчасці фотамастака. Час як тэма і пагружэнне ў мінулае як працэс перасталі быць прадметам абстрактнай цікавасці Вадзіма Качана і набылі статус канкрэтнай характарыстыкі яго творчасці з таго самага моманту, як ён узяў у рукі фотакамеру. Па прызнанні самога аўтара, магчымасці фотакамеры як выдатнага інструмента даследавання часу і прасторы ўпершыню захапілі і натхнілі яго на выстаўцы фотаклуба "Мінск" — калісьці аднаго з самых аўтарытэтных фотааб'яднанняў Савецкага Саюза. На той час Вадзім Качан стаў адным з нямногіх беларускіх аўтараў, работы якіх былі адзначаны заходнімі куратарамі выставак сучаснай фатаграфіі і ўнесены ў сур'ёзныя выдавецкія і іншыя праекты, найбольш значны з іх — "Фотаманіфест. Сучасная фатаграфія ў СССР" 1991 года.

Альбом "Фотографии прошлых лет" — вынік вяртання Вадзіма Качана да творчасці пасля доўгага перапынку. Прадстаўленая ў выданні падборка — асэнсаванне ўсяго, што зрабіў аўтар, на новым узроўні, у тым ліку і тэхналагічным. Так, напрыклад, фотамантаж, якім карыстаецца майстар для дасягнення эфекту перакрыжавання паралельных вобразных і геаметрычных прастораў. На змену ручной тэхналогіі фотамантажу прыйшоў камп'ютэр. Эпоха новых тэхнічных магчымасцяў успрымаецца многімі як канец "века фатаграфіі". Для Вадзіма Качана гэта пачатак новай эпохі ў рабоце з фотаздымкамі, і назапашаны вопыт і творчы багаж дае спадзеву, што выдавецкі праект "Фотографии прошлых лет" будзе мець працяг.

Тэкст і фота В.КАВАЛЁВА

Ёсць людзі, што сонечныя промні: душою цёплыя, светлыя. Самі з ахвотай жывуць, іншым жыццё ўпрыгожваюць, гору-бядзе не скараюцца. Менавіта з гэтай кагорты — Аляксандра Шыбко. Адзіная і непаўторная ... хоць бы ў тым, што так і не знайшлося больш ва Уздзе жанчыны, якая штодзень на працу ды з працы дабіралася... выключна на мапедзе. Чатыры адзінкі гэтай, прама скажам, нежаночай тэхнікі "ўмясціў" яе працоўны стаж! Пра гэта ведаюць многія, і мала хто — пра тое, як бязлітасна "прайшлася" па лёсе колішняй маленькай дзяўчынкі вайна. Не, нельга распавесці пра тое лепш, чым зробіць гэта сама Аляксандра Сяргееўна.

Яе «універсітэты»

Шура

— Мы жылі тады ў вёсцы Фральцова, што на Смаленшчыне, з матуляй і сястрой. Вёску бамбілі, і яна неаднойчы пераходзіла то да немцаў, то да нашых, бо месціцца якраз на шляху да Масквы. Неяк увесну ў наш двор забег немец і закамандаваў пакінуць дом: пагналі да станцыі Гусіна — пагрузілі ў "цялятнікі". Легчы там не было дзе, і мы доўга сядзелі ўшчыльную адно пры адным. Так прывезлі ў Оршу, паставілі на запасныя пуці — паміж нямецкімі эшалонамі з салдатамі і тэхнікай. Майскай ноччу 43-га Оршу бамбілі савецкія самалёты. Бесперапынна. Выбухам "зрэзала" дах нашага вагона. Мама сказала: "Дачушкі, ляжам побач. Жывымі адсюль не выйдзем: заб'юць — дык хоць усіх разам". Што мы і зрабілі.

...Я расплюшчыла вочы і ўбачыла скалечанае маміна цела. І пачула голас сястры: "Жывая?" Гэта і быў мой другі дзень нараджэння. А ішоў мне дзевяты год. Шаснаццацігадовая сястра Нюра замяніла мне маці. Разам з ёю нас пазней і вывезлі ў Германію.

Што асабліва ўрэзалася ў памяць? Спачатку нас адбіралі, дзялілі на групы, правяралі на хваробы, стрыглі галовы дагала. Здаровых выводзілі ў адны дзверы, "выбракаваных" — у другія. Туды, дзе з вялізнай трубы валіў чорны дым. Пасля — зноў дзялёжка: малых — у адну калону, працаздольных — у другую. Нас, казалі, павязуць цягнікам, іх — на караблі. Я крычала і плакала: не хацела разлучацца з сястрой. Гэтак прасілі каменданта мая Нюра з сяброўкай, што ён... згадзіўся. Колькі шчасця было!.. Лічы, трэці мой дзень нараджэння, бо абяцаным цягнікам для дзяцей стаў крэматорый...

Так мы апынуліся ў горадзе Брандэнбургу. На цяжкіх сельгасработах працавала старэйшая сястра, а я — у цэху прадзільнай фабрыкі: прыбірала там, звязвала абарваныя ніткі. Пра вызваленне ўжо і не марылі. А прыйшло яно нечакана. Была цёплая майская ноч. Мы начавалі ў бункеры: Брандэнбург часта бамбілі. Раптам стала так ціха! Толькі вада ў рацэ шумела. Пасля казалі, што гэта нашы перапраўляліся... Тыя, хто быў наверсе, пачулі рускую мову. У бункеры было нас вельмі многа: спалі седзячы. Прачнуліся ад шуму адкрываемых дзвярэй. І многія ўпершыню за ўсю вайну ўбачылі жывога рускага салдата — з пагонамі, медалямі. Жанчыны плакалі... Выбеглі на вуліцу, а там — нашы танкі, машыны. Толькі тады і паверылі, што прыйшло вызваленне.

Праз некаторы час нас накіравалі на зборныя пункты: адтуль мы павінны былі ад'язджаць на радзіму. А вечарам паднялася страляніна. Суцэльная, усеагульная! Я страшна напалохалася: навошта ж манілі, што вайна скончылася... Ледзьве ўбілі мне ў галаву дарослыя: маўляў, гэта ж ад радасці — перамога!

Аляксандра

Мір для былой паланянкі пачынаўся не толькі без маці — яшчэ і без бацькі, які загінуў падчас бамбёжкі, без двух братоў: старэйшы з іх прапаў без весткі, а з малодшым разлучыла вайна. Вось яго пошукамі, увайшоўшы ва ўзрост, энергічна занялася Аляксандра. Неяк трапіў да яе братаў фотаздымак — пасляваенны ужо, адкуль глядзеў на дзяўчыну капітан Савецкай Арміі. У 56-м яна нават маршалу Жукаву напісала: верыла гэтаму знакамітаму чалавеку! Аказалася, недарэмна. Адказ ад маршала прыйшоў праз два-тры месяцы: жывы-здаровы яе родзіч, служыць у Германіі.

"Дакажы, што ты — мая сястра,— прачытала Аляксандра ў такім доўгачаканым братавым пісьме. — Мне вядома, што родная вёска на Смаленшчыне спалена, цягнік з маімі блізкімі трапіў пад бамбёжку і ўсе яны загінулі." І Шура даказала: "дапамог" яе "аднакапеечны" знак на лбе, а яшчэ ... горкі расповед пра той чорны дзень, калі ўсе яны засталіся без маці...

Так дзяўчына "набыла" сабе брата.

А "другую палову" даў ёй лёс крыху раней. Дарэчы, "у ролі" лёсу выступіў муж яе любай сястры. Неяк прыйшлося да размовы і распавёў ён свайму сябру-франтавіку пра гаротную дзяўчынку-сірату. Той і папрасіў адрас. Дарэчы, хлопцу было 22 гады, а завочнай паненцы — усяго чатырнаццаць. Роўна шэсць гадоў цягнулася іх перапіска. Прычым Валодзя не толькі лісты гаротнай сіраціне дасылаў, яшчэ й штомесяц — сторублёўку.

Потым яны сустрэліся. Уладзімір перадаў Аляксандры свой бумажнік: "Распараджайся, як лічыш патрэбным. Будзь гаспадыняй".

Аляксандра Сяргееўна

Яна і стала — жонкай і гаспадыняй, маці трох дзяцей і бабуляй дзесяці ўнукаў... Гэтымі днямі спаўняецца ўжо пяцьдзесят гадоў з таго часу, як Аляксандра Сяргееўна Шыбко вядзе "хатнюю бухгалтэрыю". Іх сямейны саюз Уладзімір Міхайлавіч, малая радзіма якога — прыгожая ўздзенская вёска Кухцічы, жартам называе саюзам Беларусі і Расіі. І атрымаўся ён трывалым і надзейным. З такою жонкай, завярае гаспадар, нельга не жыць душа ў душу.

... Апрача "залатога вяселля", якое, лічы, прыпадае на вялікае свята — Дзень Незалежнасці, сёлета ў доме сям'і Шыбко "здарыліся" яшчэ два юбілеі. Гаспадыні споўнілася семдзесят. І шэсцьдзесят — Вялікай Перамозе, без якой увогуле ўсё гэта было б проста немагчыма.

— Базавую адукацыю я атрымлівала ўжо тады, калі двух дзяцей гадавала: якраз трэцяга чакалі, — прыгадала Аляксандра Сяргееўна. — На мапедзе па адукацыю ездзіла — мо, таму шафёр нарадзіўся? У Мінску працуе, на пасажырскім аўтобусе.

Яна так марыла стаць настаўніцай!.. Мару здзейсніла дачка, якая працуе ў раённым аддзеле адукацыі. А маці на ўсё жыццё засталася сціплай загадчыцай склада. Ці задаволены сабою, жыццём, Аляксандра Сяргееўна?

— Мне вельмі шанцавала на добрых людзей. А можа, проста час такі добры быў?

А, можа, дададзім, проста чалавек такі — добры, да якога людзі міжволі "прыцягваюцца"?

Іх шмат — самых розных людзей на фотаздымках, якія беражліва захоўвае ў сваіх фотаальбомах Аляксандра Сяргееўна. Здымкі зроблены яе рукамі: фатаграфія — любімы занятак! З асобым задавальненнем здымала фатограф-аматар помнікі. Ёсць і Мінск, і Смаленск. Ёсць і родная вёска — папялішча, хлеў... Могілкі. Боль... Аляксандра Шыбко — з тых людзей, што не пытаюцца, чаму свята Незалежнасці ў нашай Айчыне супадае са святам вызвалення Беларусі ад фашысцкіх акупантаў...

Святлана МІХАЙЛОЎСКАЯ,
Інеса ПЕТРУСЕВІЧ
г. Узда Мінскай вобласці.

Сярод дзяўчынак, што на гэтым здымку, вы не знойдзеце маленькай Шуры. Тут — яе "сястрычкі па бядзе": іх дзяцінства таксама "з'едзена" вайною. Стаўбцоўскі раён, вёска Засулле, 4-ы клас мясцовай школы. Канец саракавых... Чыесьці — хударлявыя, паўгалодныя — будучыя мамы...

Фота забяспечана аўтарамі

АБСЯГІ

МАГІЛЁЎШЧЫНА

Крычаў

Палац на рэканструкцыі

Пачалася рэканструкцыя палаца, які быў пабудаваны ў XVIII стагоддзі ўладальнікам Крычава і фаварытам расійскай імператрыцы Кацярыны II князем Пацёмкіным.

Будаўнікі ўжо разабралі дах. На рэстаўрацыю вядомага помніка архітэктуры ў гэтым годзе выдзелена 400 мільёнаў рублёў. Варта адзначыць, што гэта не першая спроба вярнуць да жыцця палац. Тыя, якія прадпрымаліся раней, з прычыны нестабільнага фінансавання завяршаліся кансервацыяй архітэктурнага помніка.

Застаецца спадзявацца, што на гэты раз усё будзе інакш.

Краснаполле

Чытанні краязнаўцаў

На базе народнага гісторыка-краязнаўчага музея СШ № 2 Краснаполля прайшлі першыя краязнаўчыя чытанні прадстаўнікоў грамадскай ініцыятывы Асацыяцыя краязнаўцаў малых мястэчак Магілёўшчыны. Месца правядзення іх выбрана невыпадкова. У Краснаполлі жыў і працаваў вядомы краязнаўца, аўтар 14 кніг пра мінуўшчыну роднага краю, стваральнік і захавальнік унікальнага школьнага музея Леанід Лабаноўскі. Тут таксама цікавыя напрацоўкі і дасягненні ў вывучэнні гісторыі роднага краю маюць і музеі шэрагу вясковых школ.

Краязнаўцы наведаліся ў школы раёна, дзе грунтоўна і ўсебакова пазнаёміліся з работай музеяў — Аляксея Пысіна (Палужская), краязнаўчага (Ленінская), народнага гісторыка-краязнаўчага (СШ № 2 Краснаполля). Карыснай і павучальнай была і экскурсія па залах раённага гісторыка-этнаграфічнага музея. Супрацоўнікі яго, для прыкладу, сабралі вялікую і унікальную калекцыю мясцовых ручнікоў, афармілі залу, экспанаты якой распавядаюць аб адселеных з-за радыяцыі вёсках, жыцці Краснапольшчыны пасля катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

Вялікую цікаўнасць у краязнаўцаў выклікала падзвіжніцкая дзейнасць педагагічнага і вучнёўскага калектываў Горскай этнашколы, якую ўзначальвае Валянціна Марчанка. З наступнага года навучальная ўстанова атрымае статус этнакомплексу школа-сад. Таксама была арганізавана сустрэча з лаўрэатам шматлікіх рэспубліканскіх фестываляў гуртам аўтэнтычнага фальклору "Горскія харашухі". Краязнаўцы паслухалі некалькі мясцовых народных песень, пазнаёміліся з асаблівасцямі тутэйшага вясельнага абраду.

Надзвычай уразіла і тая работа, якая праводзіцца ў народным гісторыка-краязнаўчым музеі СШ № 2 Краснаполля. Для ўдзельнікаў чытанняў была прапанавана разгорнутая экскурсія па пяці залах музея, якую бліскуча правялі юныя выхаванцы і паслядоўнікі Леаніда Лабаноўскага, і тэматычная экскурсія "Пісьмы з фронту". Адбылася прэзентацыя сігнальнага экземпляра чарговай кнігі Л. В. Лабаноўскага "Краснаполле: у промнях Чарнобыля", якая выдаецца ў Мазырскім выдавецтве "Белы Вецер".

Удзел у першых краязнаўчых чытаннях прынялі больш як 25 аматараў вывучэння і папулярызацыі мінуўшчыны роднага краю з Бялыніччыны, самога Краснаполля і раёна, Клімаўшчыны, Шклоўшчыны... У сваіх навуковых паведамленнях і дакладах яны прыводзілі цікавыя факты, асвятлялі самыя розныя падзеі гістарычнага развіцця населеных пунктаў Магілёўшчыны — сваіх радзінных куточкаў. Гэтыя матэрыялы плануецца выдаць асобнай брашурай.

Напрыканцы сустрэчы ўдзельнікі чытанняў выказалі падзяку за цёплы прыём, гасцінасць і ўсямернае садзейнічанне іх плённай працы намесніку старшыні райвыканкама Тамары Каваленцы, начальніку аддзела адукацыі райвыканкама Валянціне Цвятковай, дырэктару Краснапольскай СШ № 2 Святлане Маргуновай.

На чарговыя свае чытанні краязнаўцы малых мястэчак Магілёўшчыны збяруцца ў наступным годзе на Клімаўшчыне — у мястэчку Міславічы.

Міхась БОЛІНСКІ

Ці патрэбна грамадству мастацкая літаратура?

«Ну што за недарэчнае пытанне? — скажа нехта. — Вядома, патрэбна».

Аднак жа гэты просценькі адказ нічога не праясніць у нашай агульнай сітуацыі і не аблегчыць нашых цяжкасцей і бедаў. Больш за тое, адразу выявіцца, што, каб пацвердзіць гэту фразу «правільны чалавек» не даласць якіх-небудзь аргументаў.

А між тым, гэта адно з самых капітальных пытанняў сацыяльнага развіцця грамадства, хоць грамадства ніколі асабліва не засяроджвала на гэтым увагі: ну, былі раней паэты і празаікі, складальнікі розных фантазій (на цяперашні лад, публіцысты), казачнікі, што працавалі для дзяцей, пісаліся п'есы для тэатра (а сёння сцэнарыі для радыё, кіно і тэлебачання) і сякія-такія разважанні вакол усёй гэтай пісаніны людзей дасведчаных ці не надта, — хай застаецца, як было.

Але «як было» ўжо не можа быць. Сёння лічыцца неабвержным фактам, што рух сусветнай цывілізацыі прынцыпова змяніўся: раней падзеі вызначаліся суадносінамі сілаў, што складваліся натуральна, сёння ж яны вызначаюцца змовай міжнародных таемных арганізацый, якія кантралююць амаль усе сусветныя фінансы, эліту — у многіх краінах, асноўныя прыродныя багацці планеты. Не кажу ўжо пра так званыя сродкі інфармацыі і камунікацыі — тут аўтсайдэры проста бездапаможныя.

У адным з нядаўніх артыкулаў я нават канстатаваў, што ў цяперашнім свеце намаганнямі глабалістаў наогул спынена плынь гісторыі. Гэта значыць, заводы працуюць, самалёты лятаюць, людзі ядуць, п'юць, гуляюць на вяселлях, але падзей, якія б прынцыпова мянялі ўсталяваны сусветны парадак, ужо не адбываецца: іх проста блакіруюць. І дзеля таго, каб блакіраваць больш паспяхова, працягваюць глабалізацыю, гэта значыць падводку ўсіх пад адзін «кімсыці» вызначаны стандарт. Адсюль «каляровыя рэвалюцыі», агрэсіўныя войны, нечуваны разбой татальнай прапаганды. Нас замбіруюць, нашы меркаванні фабрыкуюць, нашы перакананні праграмуюць...

Ва ўмовах ліхаманкавых пераменаў і знарочыстага ажыятажу, у абставінах крушэння ранейшых духоўных і маральных апор і агульнага паслаблення культурных асноў з'яўляюцца стымулюемыя «кімсыці» і «чымсыці» настроі самапрыніжэння, іроніі, гэтакай адвязанасці хуліганa, якому ўжо анічога не шкада.

У газеце «Советская Белоруссия» (29.04.2005) у рубрыцы «Культура» надрукаваны досыць паказальны артыкул Людмілы Рублеўскай «Боскае вар'яцтва ў якасці табурэткі».

Артыкул знарочыста задзірлівы — скача па сентэнцыях, набраных у Інтэрнеце, імітуючы якуюсьці худасочную «дыскусію» аб прыродзе паэзіі, якой на самай справе няма.

Але артыкул сімпатычны: ён зводзіць паэтычную творчасць да капрызаў чалавечае прыроды. Аб'ектыўна ён выяўляе ўстаноўку тых новых «прагрэсіўцаў», якім загадана лічыць блюзнерствам меркаванні аб паэзіі і мастацкай літаратуры як аб нечым істотным, у чым маюць патрэбу культурныя народы.

«Дзе ж месца паэзіі ў свеце мас-медыя? У рэкламных лозунгах-закліках? У інтэлектуальных «тусоўках»: І чаму, хоць паэтычныя зборнікі выходзяць накладамі ў пару соцень экземпляраў, рэдакцыйныя партфелі і літаратурныя сайты трашчаць ад мноства вершаваных спроб? Здавалася б, спрэчкі фізікаў і лірыкаў ужо даўно перасыпаны нафталінам на паліцах гісторыі, ды сёння адна за адной успыхваюць палемікі ўсё пра яе ж, пра паэзію. Але нават у наш рацыянальны час паэзія ўспрымаецца праз прызму міфаў», — піша Л. Рублеўская. І каменціруе «міфы», якія ўсю сур'ёзнасць справы зводзяць да досыць прымітыўных анекдотаў.

Гэта значыць, перад намі **сучасны ліберальны** погляд на паэзію (ён спакваля ўкараняецца) і нават з элементамі ёрнічання: «Платон у сваёй ідэальнай дзяржаве збіраўся паэтаў знішчыць. Арыстоцель лічыў, што паэты надзелены «боскім вар'яцтвам». У Расіі ім было прадпісана перш за ўсё быць грамадзянамі, а пасля ўжо паэтамі».

Між тым, мастацкая літаратура — гэта галіна грамадскай свядомасці, духоўнай вытворчасці, і яна не менш важная і неабходная, чым прамысловасць ці сельская гаспадарка.

Проста мы ніколі не задумваліся пра гэта ўсур'ёз, бо мастацкая літаратура гістарычна неўпрыкмет увайшла ў жыццё цывілізаванага грамадства ў адзінай плыні ягонае культуры (разам з музыкай, жывапісам, скульптурай, архітэктурай і г.д.).

Але я вылучаю мастацкую літаратуру, таму што (з пэўнай доляй умоўнасці) акурат яна і складае самую дынамічную частку нацыянальнай культуры.

Дзякуючы літаратурнай вытворчасці грамадства атрымлівае, кажучы сучасным жаргонам, **аўтарытэтны маніторынг свайго цяперашняга і перспектыўнага ідэйна-маральнага стану.**

Гэта не проста «літаратурныя героі», з якімі знаёмяць школьнікаў, гэта сацыяльныя тыпы і сімвалы мадэляў грамадскіх паводзінаў — Абломаў, Тарас Бульба, Паўка Карчагін, персанажы «Капітанскай дачкі», раманаў Дастаеўскага, Горкага і д.т.п.

Вядома, гэта не азначае, што ў любы навейшы перыяд могуць быць сканструяваны свае паўнавартасныя вобразы, якія пэўным чынам будуць выяўляць і фарміраваць пераважную мараль грамадства, але зразумела, што грамадства і ягоная эліта, калі яна не страціла пачуцця адказнасці, крэўна зацікаўлена ў тым, каб гістарычны досвед жыцця засвойваўся пакаленнямі як мага больш грунтоўна.

Мы не можам у прынцыпе ігнараваць сацыяльныя і палітычныя (канфесійныя, этнічныя) супярэчнасці ў грамадстве, як не можам не разумець, што працэс літаратурнай вытворчасці распадаецца відочна на некалькі частак, якія адыгрываюць розную, часам узаемавыключную ролю.

Галоўнымі творцамі выступаюць майстры, якія працуюць у рэчышчы бясконца багатай класікі. Побач з гэтым існуе пласт снабісцкай літаратуры, якая, незалежна ад ейных сапраўдных ці прыхаваных мэт, абслугоўвае перш за ўсё самую сябе, абмяжоўваючы свет пісьменніка і чытача штучнымі і ўмоўнымі пабудовамі.

Агромністая плынь — гэта, умоўна кажучы, другаразрадная літаратура, дзе непераборлива прадстаўлены пачаткоўцы, графаманы, а таксама ўсялякія жулікі-бізнесмены, што робяць грошы на пустышках, і ангажаваная група пісакаў-ідэолагаў, што абслугоўваюць часцей за ўсё пазанацыянальныя інтарэсы.

Гэтыя, апошнія, вядома, такія ж шкодныя і ядавітыя, як і тыя, што ствараюць свае літаратурныя кар'еры не на служэнні культуры, народу і вышэйшым маральным ідэалам, а на попыце разбэшчаных і апушчаных, здольных аплаціць свой попыт на духоўны наркотык, парнаграфію і награмаджэнні жахаў, што неяк прыміраюць вычварэнцаў з няўтульнай рэчаіснасцю.

Ідэалагічны вораг імкнецца падарваць грамадскія асновы, абсмяяць і зняважыць народныя ідэалы, укараніць бацылы апалітычнасці, здрадніцтва, крайняга эгаізму.

У гэтым найскладаным калейдаскопе інтарэсаў надзвычай важную ролю заклікана выконваць літаратурная крытыка, прычым літаратурная крытыка, якая па сваім інтэлектуальным і маральным патэнцыяле адпавядае ўзроўню самых высокіх дасягненняў нацыянальнай літаратурнай класікі.

Звярніце ўвагу: такой літаратурнай крытыкі ў СССР на яго апошняй стадыі драматычнага існавання ўжо практычна не было. Цяпер, пасля сыходу падзвіжнікаў літаратуры тыпу В. Кожынава і Т. Глушковай, літаратурна-крытычная думка нават у Расіі істотна аслабела. Метадалогія ейная стала яшчэ больш прымітыўнай, вартая жалю «адсябяціна» выцясняе неаспрэчныя крытэрыі агульнасусветнай культуры.

У нас у Беларусі магутнай нацыянальнай крытыкі як не было, гэтак і няма. Між тым, толькі такая высокая і агульнапрызнаная літаратурная крытыка, здольная правільна ацаніць гістарычныя перамены і ўбачыць перспектыву, магла б эмацыянальна і псіхалагічна перакананаўча абгрунтаваць новую расстаноўку грамадскіх сіл, адштурхоўваючыся ад найбольш таленавітых літаратурных твораў класічнага кшталту.

Беларусь знаходзіцца на вельмі складаным этапе свайго развіцця. Ранейшыя формы работы дзяржавы з пісьменніцкай масай разбураны, а новыя ўсё яшчэ канчаткова не створаны. Асобныя пытанні не вырашаны нават прынцыпова.

Рынак, у які мы ўжо ўвайшлі, смяецца над ідэалізмам традыцыйнага беларускага пісьменніка. Гэты пісьменнік карыстаецца зараз поўнай свабодай на «няўвагу грамадства» да сваёй працы, а гэтую працу рынак і сусветныя палітычныя сілы, што стаяць за ім, хочуць прысвоіць і ператварыць у тавар, вакол якога ўжо круцяцца свае «прадзюсеры», выбудоўваецца свая схема рэкламнай накачкі прыдатных («рынкавых») і замоўчвання непрыдатных («нярынкавых») аўтараў.

Літаратурная вытворчасць ажыццяўляецца сёння недапушчальна прымітыўным, саматужным чынам, адзіночкамі, нярэдка на ўласныя капейкі.

Прафесійна гэта ўжо аніяк не ацэньваецца, бо сур'ёзная літаратура алігархаў не цікавіць, яна для іх небяспечная. А мецэнаты з нацыянальных палітыкаў занадта слабыя, каб падтрымліваць хоць бы выбраных. Крытэрыі дасканаласці не ўздымаюцца, а падаюць.

У выніку грамадства пазбаўлена наймагутнага сродку самакарэкцыі, паколькі ні радыё, ні тэлебачанне, ні кіно («слуханкі» і «глядзелкі», што не абапіраюцца на класічную мастацкую літаратуру) гэтае ролі паўнацэнна не выконваюць і выконваць не могуць.

Часцей за ўсё яны выступаюць не як мудрыя лекары-збаўцы, а як рэпарцёры-натуралісты ці нават перасмешнікі, што смакуюць чужое гора, ствараюць скажонае ўяўленне аб краіне і яе народзе.

Паўнацэннае жыццё арганізма — гэта заўсёды баланс функцый. Тое ж датычыцца і грамадства. Між тым, у нашым грамадстве адбыліся радыкальныя змены, многія важныя наступствы якіх належным чынам усё яшчэ не ацэнены.

Ясна, што аднымі фінансавымі рашэннямі, якімі б шчодрымі яны ні былі, праблем бездапаможнага становішча творчай прадукцыі і — адначасова — работнікаў нацыянальнай літаратурнай вытворчасці мы не вырашым, — патрэбны больш шырокі падыход да ацэнкі і рэгулявання ўсіх з'яў.

Прыгадайце, мы дакладна гэтак жа «калупаліся» вакол праблем ідэалагічнай работы, пакуль не ўмяшаўся Кіраўнік нашай дзяржавы і не расставіў адпаведныя акцэнты.

Мастацкая літаратура — гэта галіна, вельмі блізкая да нашай дзяржаўнай ідэалогіі, і, вядома, яна мае права разлічваць на пэўнае дзяржаўнае спрыянне.

Галоўнае тут — не фінансавая дапамога сама па сабе і ў ранейшым выглядзе, а сістэма прававых актаў, якія падтрымлівалі б як літаратурную вытворчасць у класічных канонах, так і сістэматычнае і сур'ёзнае прачытанне створаных твораў літаратурнай крытыкай. Інакш кажучы, справа ідзе пра экспертызу найважнага параметра грамадскай думкі.

Інстытут літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук мае свае задачы, якія выконвае пакуль не самым лепшым чынам і таму наўрад ці можа быць з поспехам скарыстаны для вырашэння новых праблем.

Не выконваюць і не выканаюць сваіх абавязацельстваў і існуючыя творчыя саюзы: ва ўмовах палітычнага размежавання яны хінуцца да выяўлення вельмі карпаратыўных, прагматычных ці «наднацыянальных», мякка кажучы, інтарэсаў, хоць шумнай дэмагогіі тут няма.

Але пытанне трэба вырашаць.

Захад не мае вартага ўвагі досведу стымулявання вялікай літаратуры: у яго няма гэтай літаратуры, ён жыве старым багажом, а тое сапраўды адметнае, што з'яўляецца час ад часу, — гэта выпадковае, выцлумачальнае законамі буйных лікаў.

Нам патрэбны свой досвед, бо славянства без вялікай культуры, гэта значыць, без вялікай мастацкай літаратуры, проста не выжыве: у славянстве быў і застаецца галоўным духоўны складнік. Славянства адкрыта для ўсяго свету і таму адкрыта кожнаму народу, з якім судакранаецца, хоць ужо і расчараванне нарастае: сённяшні глабалісцкі свет адно эксплуатуе і топча чужую душэўную шчодрасць, яму ўжо даўно незразумелыя гуманістычныя крытэрыі, — ён прымае іх за недаразвітасць і дурноту.

Служэнне праўдзе і дасканаласці ў імя ўсіх народаў — гэта заўсёды было стрыжнем нашай гісторыі. Гэты стрыжань немагчыма змяніць, не змяняючы нашай сутнасці, што, аднак, і рызыкоўна і небяспечна.

Радыё, тэлебачанне, Інтэрнет — усё гэта, вядома, развівае ўяўленне. Але адначасова і абмяжоўвае яго. А што дае поўны прастор уяўленню, дык гэта класічная мастацкая літаратура ўсіх жанраў.

Без развітага ўяўлення няма вучонага, няма палітыка, няма культурнага чалавека.

Клопат аб развіцці ўяўлення — гэта, можа, галоўнае ў выхаванні нацыі. Прыгледзьцеся, усе ўшчэрбныя людзі пакутуюць найперш ад няразвітасці свайго ўяўлення, ад адсутнасці сумлення, якое паказвае перш за ўсё на вынікі таго ці іншага дзеяння.

Алкагалізм, наркаманія, эратычныя ўяўленні распуснага суб'екта — гэта ўжо анамалія, хвароба, гэта хімерычнае ўспрыманне жыцця, што выключае творчасць, стваральнасць.

Можа быць, Беларусь знойдзе такі арыгінальны і эфектыўны алгарытм дзеяння, які ажывіць як літаратурную вытворчасць, так і яго пастаянную ацэнку з самых высокіх пазіцый маральнасці і культуры?

Ці досыць будзе па першым часе літаратурна-крытычнага часопіса?

Давайце разам падумаем і выкажам свае меркаванні, хоць бы на старонках літаратурных выданняў.

Пагадзіцеся, гэта і вялікая ўдача, і вялікі подзвіг пісьменніка, калі яму ўдаецца выявіць тыповы вобраз сучаснасці ў такім героі, які становіцца практычна бессмяротным, як героі Талстога, Сервантэса ці Шэкспіра.

Ці будзе аддзяка за гэты подзвіг у срэбры, гэта ўжо іншае пытанне. Хутчэй за ўсё, не будзе, бо сапраўды буйны дзеяч літаратуры ніколі не зыходзіць з матэрыяльных меркаванняў. Больш за тое, на долю ягонага служэння часцей за ўсё выпадаюць дадатковыя цяжкасці, паколькі ён не можа не канфліктаваць з тымі, хто супрацьстаіць ягонаму народу, а гэтых «агентаў уплыву» ў сучасным грамадстве робіцца ўсё больш і больш, — глабалізм ставіць менавіта на калону здрайцаў нацыянальных традыцый.

Дык ці варта чакаць, пакуль яны заварушацца ўсёй хеўрай?

Ёсць яшчэ адзін паварот усёй гэтай шырокай тэмы, які я хацеў бы патлумачыць на прыкладзе свайго лёсу.

Так склалася, што я рос у Расіі акурат у тыя юныя гады, калі адбываецца фарміраванне актыўнай асабістай моўнай культуры. Я пішу паруску.

Але беларускі народ — двухмоўны. У ім прадстаўлены дзве галіны моўнай літаратурнай культуры — беларуская і руская.

І хоць я не лічу, што руская мова ўшчамляе мяне як беларуса, хоць я люблю рускую мову, мову вялікіх прарокаў, усё ж я не магу адмовіцца і ад беларускай мовы, хоць і не карыстаюся ёю ці карыстаюся адно ад выпадку да выпадку.

Беларуская мова для мяне — гэта больш, чым мова маёй маці і майго бацькі, гэта той Нацыянальны Дом, дзе я адчуваю сябе паўнацэнным прадстаўніком цудоўнай галіны бессмяротнага славянства, тым больш што асновам яго існавання пагражае ўсё больш настырна і нахабна пазанацыянальная, «глабалісцкая» сіла, што змушае ўсіх і ўся мысліць толькі катэгорыямі продажу, прыбытку і падпарадкавання больш моцнаму.

Акурат таму я гатовы зведваць любыя дадатковыя цяжкасці, каб заўсёды ведаць, што над беларускай мовай, у якой старажытнаруская — наша прамова — прадстаўлена куды больш каларытна, чым, скажам, у рускай, пастаянна працуюць сумленныя і высакародныя майстры слова, што яны глыбока ўсведамляюць сваю адказнасць і гэтак жа, як рускія, украінскія ці сербскія пісьменнікі, ідуць да агульных класічных вяршыняў.

Пакуль я перакананы, што на беларускай мове магчымы свой Шэкспір і свой Пушкін, свой Гогаль і свой Дастаеўскі, я ніколі не паддамся раз'юшанай культур-агрэсіі, якая хацела б пахіснуць ува мне пачуццё паўнацэннасці майго рускага свету.

Можа быць, я выказаўся недастаткова акрэслена і зразумела для кожнага. Але гэтыя мае словы павінны быць пачуты і правільна выцлумачаны стратэгамі нашага культурнага развіцця; яны павінны забяспечыць, каб пры жаданні я заўсёды мог чуць беларускую песню, беларускія вершы, паглядзець беларускі фільм, які вяртае мне душэўна стыхію маёй нацыянальнай самасвядомасці, пачуццё Радзімы — на ўсёй прасторы маёй Беларусі.

Дзякуй Богу, што наш «бацька» акурат гэтак і разумее нашы нацыянальныя задачы, пастаянна называючы наш нешматлікі народ вялікім народам, — Прэзідэнт, як заўсёды, сціпла не гаворыць пра тое, што бачыць далёка наперадзе тыя праблемы, пра якія яшчэ нават не задумваюцца многія нашы сучаснікі-дачаснікі.

Эдуард СКОБЕЛЕЎ

Са схованак памяці

Пасля разгрому гітлераўскіх войск пад Сталінградам і на Арлоўска-Курскай дузе ў Германіі была аб'яўлена татальная мабілізацыя. Паўсюдна гучалі гебельсаўскія заклікі: "Пара скінуць белыя пальчаткі, усім браць зброю і ісці на фронт". Мужчын бралі прама ад станка, замяніўшы іх ваеннапалоннымі ці падняволенымі, прывезенымі з акупіраваных тэрыторый. Частка толькі што прызваных салдат вермахта трапіла ў Жлобінскі раён і размясцілася на станцыі Мормаль.

Салдаты татальнай мабілізацыі

Мы, а гэта невялікая група дыверсантаў, вераснёўскім днём набліжаліся да чыгункі. Планы немцаў нам былі вядомы: высечы лес на дзвесце метраў ад пуцей і праз кожны кіламетр зрабіць умацаванні накшталт дзотаў. Перад намі стаяла задача ўзарваць эшалон. Раптам заўважылі, як з Восавай Буды бяжыць хлопец. Ён і паведаміў, што ў вёску прыйшло чалавек дзесяць немцаў. Вырашылі абысці яе і на дарозе каля балота паставіць супрацьпяхотную міну, зрабіць засаду. Але не паспелі дайсці да намечанага месца, як каля Восавай Буды раздаліся выбухі, застрачыў кулямёт. Агледзеліся. Частка немцаў пабегла да лесу, каб трапіць на дарогу. А двое адсталі і беглі да нас. Трое партызан падышлі да балота і зрабілі засаду. З Сашкам Кісляком пабеглі насустрач тым дваім. Яны заўважылі. Адзін кінуўся да лесу, а другі наогул знік. Сашка двойчы стрэліў, першы немец упаў. Падбеглі да яго. Немец, махаючы рукою, паўтараў: "Гітлер капут..." і глядзеў на нас поўнымі слёз вачыма. Мне стала шкада. Адчапіў ад яго вінтоўкі рамень і аддаў Сашку, каб ён перавязаў яму нагу вышэй раздробленага калена. Сам кінуўся шукаць другога. Але бачу: з крайняга двара бяжыць жанчына, махае хусткай і крычыць: "Лажыся! Лажыся!". Я спыніўся. Яна паказала рукой у бок высокага дзядоўніка. Раптам бачу, там усхапіўся немец і падняў рукі ўгару. Жанчына бачыла, як ён цэліўся ў нас. Я падбег. Ён адразу пачаў зубамі рваць падкладку мундзіра, дастаў паперку і аддаў мне. Глянуў на яе: там было штосьці напісана па-нямецку. З палонным пайшоў да параненага, якога Сашка ўжо перавязаў... Паднялі яго, пайшлі ў вёску. Як высветлілася ўжо ў атрадзе, паперка, якую даў палонны, сведчыла аб прыналежнасці Фрыдрыха (прозвішча не памятаю) да камуністычнай партыі Германіі: жонка зашыла дакумент у адзенне, як своеасаблівы талісман. Палонны сцвярджаў, што гебельсаўская прапаганда вушы пратрубіла: маўляў, рускія нямецкіх салдат у палон не бяруць — на месцы расстрэльваюць. Ужо не кажучы пра партызан. А паранены, аказалася, належаў да нацыянал-сацыялістычнай партыі. У атрадзе ён і памёр. Фрыдрых жа заставаўся ў партызан да злучэння з савецкімі войскамі.

Помста цаною жыцця

У пачатку кастрычніка 1943 года мы, стомленыя, мокрыя, вярталіся з чарговага задання і спыніліся ў партызанскай зоне, у вёсцы Новая Карма, дзе жылі мае бацькі. Я зайшоў дадому, Генадзь Зубо — да сваіх бацькоў. Іван Татарынаў, Лявон Арлоў, Сашка Кісляк размясціліся ў суседніх хатах.

На досвітку хтосьці моцна пастукаў у акно. Чую, маці пайшла адчыняць дзверы. У хату забегла Ніна Драздова, дзяўчынка год трынаццаці: да іхняга калодзежа падышлі двое немцаў! Як заўсёды, пункт збору быў у канцы вёскі, адкуль пачыналася балота. Я хутка апрануўся, узяў аўтамат і выйшаў з хаты. Звычайна наша група пазбягала ўвязвацца ў бой у вёсках, бо лепш абысці і дзесьці зрабіць засаду. Да пункта збору накіраваўся не па вуліцы, а, як у нас кажуць, па захлеўі. Прайшоў крыху, бачу: нібы слупы, стаяць па ўсім выгане немцы. Вёска акружана. Кінуўся ў чужы двор і хацеў прабегчы па вуліцы, каб сустрэцца з хлопцамі і разам прарывацца. Але паўсюдна — немцы. Заўважылі мяне, пачалі страляць. Зразумеў: партызаны кінуліся абыходзіць вёску, ды натрапілі на гітлераўцаў. Амаль развіднела, і ўжо відаць, як з аднаго краю вёскі, з другога ідуць ворагі. Вырашыў, якая група першая падыдзе да мяне — ссяку з аўтамата, каб заплаціць за сваё жыццё. Раптам выскоквае з хаты Сідар Астапенка: Богам просіць, каб не страляў ад яго дома, лепш схавацца пад падлогу, у склепе. Астапенка праз вокны бачыў чужынцаў — у хаце трое малых дзяцей, жонка. Склеп быў цагляны, затынкаваны. Варожы салдат з саду заўважыў нас, і вось я пачуў нямецкую мову і грукат ботаў па падлозе. Валасы ўзняліся пад пілоткай! Падумаў, як толькі гітлеравец адкрые маснічыну, кіну праз лаз гранату. Немец пахадзіў па хаце, яго, напэўна, супакоіла акно, што з кладоўкі адчынялася ў садок. А там — зараснік вішняку... Гаспадару было загадана апрануцца і ісці ўслед. Жонка запрычытала, дзеці заплакалі. Трэба вызваляць гаспадара! Але жанчына сказала, што ўсіх мужчын збіраюць на вуліцы. А праз гадзіну — немцы з вёскі пайшлі і пагналі мужчын за сабою. Я вылез і пабег туды, дзе раней гучалі стрэлы. У неглыбокай канаве ўбачыў Івана Татарынава. Каб не трапіць жывым у рукі фашыстаў, ён пусціў сабе з аўтамата тры кулі ў скроню. Следам за Іванам бег і Сашка Кісляк. Але ён першы заўважыў ворагаў, павярнуўся і пабег на другі бок вёскі. Там сустрэўся з Лявонам Арловым. Па гародах, паміж ланцугом і вёскай, прабіраліся да балота, да пункта збору. Сашка быў у нямецкім фрэнчы, а Лявон — у чорным пінжаку. Па Арлову гітлераўцы пачалі масіравана страляць, і ён упаў. Падбеглі і штыкамі пакалолі яму твар, грудзі. Кісляк дабег да першых кустоў каля балота, а там сядзелі з кулямётам двое гітлераўцаў і, напэўна, прынялі Сашку за свайго. Ён жа наскочыў на іх, ударыў аднаго ботам і пабег далей. Кулямётная чарга рванула вышэй калена нагу, але Сашка працягваў бегчы. Потым сеў на купіну, перавязаў рану. Абапіраючыся на вінтоўку, дайшоў да дарогі, па якой якраз ехаў мужчына з суседняй вёскі. Партызана ён ведаў. Узяў яго на калёсы і даставіў да сяброў па зброі.

Генка Зубо таксама бегаў то на адзін бок вёскі, то на другі. Зразумеў, што яна акружана, захаваў зброю і пайшоў у сваю хату. Там хуценька распрануўся і лёг у ложак. Жонка намачыла ручнічок, прыклала на ягоны лоб, побач паставіла табурэтку з рознымі лекамі, бутэлечкамі, нават паклала тэрмометр. Сама была цяжарная, і немец, які забег у іх дом, паверыў, што мужык хворы. Амаль усіх мужчын з вёскі дапрашвалі наконт партызан. Пры гэтым прысутнічаў камандзір палка. Пасля допыту сабралі ўсіх, і ён сказаў, што яго салдаты цывільных людзей не страляюць, а толькі бандытаў. І ўсім мужчынам дазволіў ісці дадому. Мужыкі здзіўляліся лагоднасці высокага нямецкага афіцэра. Але, як паведаміў нам сувязны, палкоўнік прыехаў, каб адпомсціць за брата. Той, інжынер, быў мабілізаваны ў 1943 годзе з ваеннага завода і трапіў у Жлобінскі раён. Каля Мормальскага балота яго і забілі.

Трэба сказаць, што тактыка палкоўніка была простай, але разумнай. Яна заключалася ў наступным: уначы яго полк падыходзіў да пэўнай вёскі ў партызанскай зоне і акружаў яе. Калі жыхары прачыналіся і, як звычайна, ішлі да калодзежаў, па ваду, некалькі салдат выходзілі на вуліцу, знарок паказваліся ім і знікалі. Людзі адразу ж білі трывогу, партызаны адыходзілі ў больш скрытыя мясціны, дзе немцы звычайна ставілі кулямёт. З 3 па 14 кастрычніка акупанты забілі каля 20 нашых, не страціўшы ні аднаго свайго салдата. Але ноч з 13 на 14 кастрычніка для самога палкоўніка стала апошняй у жыцці. Звычайна ён не ездзіў з салдатамі вёскі акружаць. Напэўна, хтосьці падказаў немцам, што вечарам у вёску Гармавічы, а гэта блізка ад гарнізона, пайшла група партызан. Праўда, ніхто не мог ведаць, што за кіламетр ад вёскі партызаны пакінулі свайго кулямётчыка Хведара Крутагаловага. Дарога ад гарнізона была добрая, і камандзір палка вырашыў сам паглядзець, як яго салдаты распраўляюцца з бандытамі. Ужо пачалі ў вёсцы пеўні спяваць, як па дарозе ў Гармавічы сунулася легкавая машына. Крутагаловы выпусціў увесь дыск з ручнога кулямёта, ускінуў яго на плечы і пабег да сваіх хлопцаў — трэба ж забраць трафеі, але наскочыў на ланцуг ворагаў. Вёска ўжо была акружана. Таму і смела ехаў палкоўнік.

Цела Хведара Пілілавіча было знявечана да непазнавальнасці. Але і для камандзіра гітлераўскага палка помста за брата каштавала ўласнага жыцця.

Уладзімір ФЕДАСЕЕНКА

З усіх культурных адкрыццяў XX стагоддзя рэальна агульначалавечаю каштоўнасцю сталіся серыялы — у шырокім сэнсе, як "цацка" з доўгатэрміновай прыцягальнасцю. Мужчынам прыемна думаць, што ахвярамі серыялаў з'яўляюцца выключна жанчыны, і гэта ёсць пераможным аргументам у змаганні за месца перад тэлевізарам падчас трансляцыі чарговай серыі "спартыўнай оперы" — не важна, бокс гэта, шашкі ці кёрлінг. Сённяшні літаратурны працэс — не столькі опера, колькі аперэта, а Іа "іспанская сарсуэла", дзе дэкламацыя пераходзіць у спевы гэтак жа прадказальна, як найноўшы трэнас у блазнаванне. Імпэтнасць, з якой айчынныя літаратары бяруць удзел у памянёным працэсе, залежыць, бадай, не ад полу — ад мастацкага тэмпераменту. Як высветлілася, аўтарак дэбютных кніг паэзіі вабяць дэкарацыі "анатамічнага тэатра". З аўтарамі ж усё не так змрочна.

«Такая ў НАС работа» (Забаўляльна-адукацыйны серыял. Частка II)

Жыццё і норавы літпралетараў: ад "канібалізму" — да медытацый



Усеваладу Гарачку не лёсіць зазнаць ні спакою мудрай старасці *літаратурнага* патрыярха, ні нават утульнай раўнавагі пісьменніцкай сталасці. Летась трыццаціпасцігадовы паэт выдаў адразу дзве кнігі — і абедзве сталіся дэбютнымі, *першымі*. Як сведчыць анатацыя да яго "Пралетарскіх песняў" (Мн., "Логвінаў"), у гэтую "першую кнігу вядомага пралетарскага паэта" ўвайшлі рэвалюцыйна-лірычныя вершы розных гадоў. У другой першай паэтычнай кнізе таго ж аўтара, выдадзенай "Мастацкай літаратурай" у серыі "Дэбют", рэвалюцыйнасці стала незраўнана менш, затое "імгненных лірычных формул" (гл. тутэйшую анатацыю) відавочна прыбыло.

Дарэчы, анатацыі да нашых літаратурна-мастацкіх выданняў варта ўважліва вывучыць перад тым, як чытаць саму кнігу, — і абавязкова перагледзець пасля: амаль заўсёды вы атрымліваеце "шкілет у шафе", але абсалютна не той, што быў абяцаны. Так, уласна *"рэвалюцыйнай дынамікі гучання"* ў "Пралетарскіх песнях" роўна столькі ж, колькі экстрэмізму ў персанажаў сённяшняй тэлевізійнай "Калыханкі". Выяўленчыя сродкі традыцыйнага фальклору (ад параўнанняў да рыфмаванняў); квазіфальклорныя інтанацыі, аплодненыя гратэскна-іранічнымі паўтонамі; рытуальныя бязглуздзіцы як частка абраду ініцыяцыі: далучэнне да найноўшасці ("*Ту-ды сю-ды — ты-ды, // Сю-ды ту-ды — дыды. // Ты ды я, я ды ты, // Ты-ды-ды — не сюды*" і г.д.) адбываецца натуральным чынам, праз "канібалізм", страваванне класікі(аў) — працытаваны верш дэкларавана як перайманне *"З Янкі Купалы"*... Усё гэта змешваецца сп. Гарачкам у трунак, пасля якога *нашы* чамусьці адчуваюць сябе па самае нельга ў класіцы сац-арту, што ім уяўляецца авангардам Авангарду.

Калі агульнае ўражанне ад кніжнага дэбюту Ус. Гарачкі-"пралетара" ўстойліва асацыіруецца з выдаткамі тэарэтыка-літаратурнай падкаванасці (ці збыткоўнасцю філалагічнай самаадукацыі) кухаркі, якую радзіма прымушае стаць камендантам Парнаса, дык "Даты" па кантрасце падаюцца плёнам творчасці непрыхаванага ворага сусветнага пралетарыяту: "*Па жоўтым лісці — // Не, не па зямлі — // Ідзём з табой: // Ступаем асцярожна. // Глядзім уверх, // Бо праваліцца можна // Ў бяздонне неба // Між пустых галін*" ("***Па жоўтым лісці). Засяроджанасць на ўнутраным быцці, тая медытатыўнасць, без якой не можа здзейсніцца сапраўдны vers libre і лёгка абыходзіцца плынь будзённай свядомасці, запісаная ў слупок, насамрэч знітаваная ў сп. Гарачкі з "формульнасцю" стылю. Тут маецца на ўвазе перадусім мінімалізм славеснага выражэння надзвычай ёмістага — "іерагліфічнага" — зместу: "*Не расчуў, // Што шаптала лістота // Вясной. // Іерогліфы // Голага голля // Чытаю*" ("***Не расчуў..."). Хаця часам лаканічнасць выражэння спараджае настолькі "заархіваваныя" метафары, што палічыць іх удалымі можа толькі надзвычай ветлівы чытач: "*Бачу, як усмешка ледзь прыкметна // Прыўзнімае губ тваіх куткі, // Разбурае* ***строгае барока*** *// Тоненькай ускінутай рукі*" ("***Гэты вечар...").

Ды нават у "Датах", ахутаных нетутэйшанясённяшняй аурай спакойнай разважлівасці і незайздрослівага шчасця быць, абзываецца такі генетычная памяць "вядомага пралетарскага паэта". Трэці раздзел зборніка — "Маналог Атланта" — наглядна дэманструе, як небяспечна жартаваць з рознага кшталту "фетышамі", "амулетамі" і "татэмамі": ты мяркуеш, што іранізуеш з трывіяльнасці, маралізатарства ды гігантаманіі, ажно незаўважна ў гэтае самае... ублытваешся: "*...ведаю // Распусцяцца ружы // І стане так добра... // І абрынецца... // Не, не дах — // Мой сусвет, // Маё неба. // Таму — я трымаю. // І покуль трымаю — // Я жывы, // Я каменны, // Я вечны*" ("Маналог Атланта").

Як казаў адзін з герояў С. Даўлатава — "мы ядзім, але ж і нас ядуць"...

Як важна не быць «арцюрам рэмбо»...

У адрозненне ад сп. Гарачкі, Рагнед Малахоўскі стаўся "ахвяраю" не *натуры*, а *культуры*, у прыватнасці, айчыннага піяру і запланаванага плюралізму меркаванняў. Адзін крытык дэбютную кнігу вершаў "Беражніца" (Мн., "Мастацкая літаратура", 2005) атрымаў ад выдаўца; другі рэгулярна наведвае кнігарню, сузірае кошты, выпраўляецца на паляванне ў сутарэнні літаратурна-мастацкіх рэдакцый — і становіцца рэцэнзентам, не патраціўшы на кнігу ні грошай, ні часу; трэці слухае радыё, чытае напісанае першым і другім — і храбра вяртаецца ва ўлонне "крытычнага бессвядомага", перажываючы рэцыдыў "адзінагалоснасці".

Толькі ў "ЛіМе" цягам апошніх двух-трох месяцаў пра "Беражніцу" выказваліся Л. Галубовіч, Н. Капа, С. Татаранскі (водгуллем — ліст Ю. Нераток). Паказальна, што ў маладзейшых спн. Капы ды сп. Татаранскага незраўнана больш ментарства ды безапеляцыйных рэкамендацый, чым у аўтара "ЛеГалізацыі": гэта як бы доктар спрабаваў лячыць чалавека, а фармацэўт выпраўляў бы небараку на могілкі. Між тым, "зялёны" (на чым настойвае паэт/крытык Н. Капа) сп. Малахоўскі выяўляе сябе паслядоўным, ***сталым*** — *захавальнікам* традыцыйных для беларускай паэзіі тэм, матываў і вобразаў ("*Вечар — цуда Матухны-прыроды, — // Крылы развінаючы свае, // Ап'яняе мяккай асалодай // І ў душы спагадліва пяе*" ("Вечар"); "*На шчодрай гронцы спелага кахання // Адлюстраванне зменлівага раю? // Мне не знайсці адказу на пытанне, // Пакуль жыву, пакуль яшчэ кахаю*" ("Чаму")). [У сувязі з апошняй цытатай заўважым, што аўтару — 21 год, а ён ужо — віртуозны "імітатар", прычым тут усё сур'ёзна, без блазнотаў і злых намераў. Спачатку авалодваем класічнай тэхнікай пісьма, і толькі пасля рушым у найноўшыя "баддлеры".];

— *змагаром* з паныласцю і дэструктыўнасцю настрояў уласнага ж пакалення: "*Прасветліцца свядомасцю сумленне, // Туман надзей ахутае дамы. // Сябе спазнаўшы, наша пакаленне // Дакажа свету, што не ўмёрлі мы*" ("Не ўмёрлі мы");

— *майстрам* **спелай** (і неадзінкавай!) *метафары*. "*смягла ручай дапівае вясёлку ўрачыстую*", "*...закаханай паэткаю клалася // ганарлівая котка за печкаю*", "*цэзію палосы // і стронцыю шырокія пракосы // крыжуюць свет за дротам небыцця*" і інш.

У "Беражніцы" не давядзецца вышукваць ні рытарычных воклічаў ("*Сам д'ябал з катла на яго зубы точыць, // А ён Чалавек! Чалавек ён! Жыць хоча!*"), ні збыткоўнасці тропаў ("*халодны позірк шчасця ліхадзейны*"), ні рытуальнага "неабайранізму" ("*Чаму я ўспомніў даўнія хвіліны, // Калі плылі былога шчасця ноты?..*") — іх заўважыць (?!) і *народны крытык*. Ды хваляваца трэба было б якраз у тым выпадку, калі б нічога з пералічанага ў дэбютнай кнізе сп. Малахоўскага не было. Тады б яго, бадай, чакаў лёс Арцюра Рэмбо, які ў свае семнаццаць панастраваў такога і столькі, што далей яму і жыць было нецікава, не тое што вершы пісаць... А так — дзякуй Богу!

Світальныя сны гарадской рыбіны

Гэта для паэтаў, што, не хаваючыся, ідуць да ўласнага стылю *традыцыйным* шляхам (праз вопыт папярэднікаў), ранняя "бездакорнасць" надзвычай небяспечная. У "кампазітараў верша" — а менавіта гэтак вызначыў паэтычную спецыялізацыю Арцёма Кавалеўскага С. Мінскевіч у пасляслоўі да "Адмысловых гульняў" (Мн, "Логвінаў", 2003) — усё не як у людзей.

Першая кніга вершаў сп. Кавалеўскага бачыцца ці не самым дасканалым у шэрагу іншых паэтычных дэбютаў апошніх двух год *праектам* — у сэнсе пралічанасці інтанацыі, выверанасці кампазіцыі, балансу "паэтычнай навукі" і "неафіцкай" шчырасці. Прадмова І. Кур'ян і каментар-эпілог С. Мінскевіча разбураюць ілюзію непасрэднасці, "стыхійнай" натуральнасці паэтавага самавыяўлення. Першы тэкст ("Вершагляд Арцёма Кавалеўскага") міжволі ўблытвае чытача ў тое, што ў салонах дэкларуецца "мастацкай філасофіяй", а ў салунах — "пантамі" (тут: філасофскім мастацтвам). Другі ("Чытаць і слухаць") адкрывае чытачу вочы на тое, што ён, чытач, для сп. Кавалеўскага — ці то студэнт, ці тое пацыент, нейкі выпрабавальны модуль для абгрунтаванага "Арцёмам уласнага шляху мастацтвання — *логафармізму*" (С. Мінскевіч). Шкада. Бо мелі мы шанц (а той, хто мінае прадмовы разам з пасляслоўямі — і дагэтуль мае) атрымаць роўнае задавальненне ад тэндэнцый сучасных (напрыклад, да "празаізацыі" паэзіі: *"Рыбіны сны // У кансервавым // Слоіку // З алеем // Змяшаліся // І з соллю"* ("***Рыбіны сны...")) — і ад мадэрнізавана-урбанізаванага "рэтра" ("*Світанак // Танчыў // На сталічных // Гмахах, // І сподак // Поўні // Падаў // У натоўп. // Крычалі // Птахі // На высокіх // Дахах. // Дзень // Штосьці // Вымавіў і — // Змоўк*" ("***Світанак танчыў...")).

"Рэвалюцыянер" з аўтара "Адмы**словых** гульняў" атрымаўся такі ж умеркаваны, як і з Ус. Гарачкі. Людзі, што ідуць да першай кнігі не адзін год (сп. Кавалеўскі — не менш за восем), відаць, мудрэюць з кожным месяцам — і абы-куды ("*[Гвалт суцэльны, // Поўны мадэрн, // І пустэча]...*" ("***Горшае...")) не ўляпаюцца.

ЗДЕСЬ вам не ТУТ

Зрэшты, як засведчыла яшчэ адна дэбютная кніга, выдадзеная "Мастацкай літаратурай" у 2003 годзе, — папярэдняе сцвярджэнне далёка не бясспрэчнае. Зборнік вершаў саракатрохгадовага (на той час) Віктара Вабішчэвіча "Чорны боль" прымушае задумацца пра хуткае выраджэнне літаратурнай крытыкі як *прафесійнай* дзейнасці. Калі колькасць падобных дэбютаў будзе ўзрастаць нават у арыфметычнай прагрэсіі, "на крытыка" не трэба будзе вучыцца — дастаткова быць пільным і акуратна перадрукоўваць цытаты.

"*Мы — людзі новай эры, // У кожнага ў крыві // Канцэпцыі і бэры // І атам нежывы*", — катрэн з верша пад *бурапеннаю* назваю "Насілі хлопцы націск" варта, верагодна, уважаць за своеасаблівую маніфестацыю прынцыпаў "трывожнага рэалізму" (як вызначае ўласны творчы метад сам сп. Вабішчэвіч). Папярэдзваю людзей неўраўнаважаных — чытацкая трывога можа ўзрастаць у геаметрычнай прагрэсіі: "*Прастора // Сціснулася, // Рыхтуючыся перайсці // У сваю новую якасць, // Але гэта не спадабалася монстру, // І ён праглынуў прастору*" ("Час і прастора"). Калі хто-небудзь сумняваецца, дзе ў грэшнага чалавека найменш шанцаў — у "страчаным раі" Дж. Мілтана ці ў Дантавым пекле, звярніцеся да верша "***Я лётаў над краем..." — праблема выбару вас, прынамсі, не будзе трывожыць: "*І цені лунаюць // І сеюць там змрок. // Там парасткі — парасткі цемры. // Са сцежкі сваёй // Не саступіш на крок — // Там царства дзікунскае хеўры*" ("***Я лётаў над краем...").

У рэшце рэшт, без хлеба могуць застацца не толькі крытыкі, але і рэдактары. Пагаджаюся з тым, што ператварэнне сучаснай літаратуры з "аўтарскай" у "рэдактарскую" — з'ява заганная. Але якраз прыклад "Чорнага болю" сведчыць пра нечуваны лібералізм айчынных рэдактараў, іх разуменне датклівасці паэтычнай натуры дэбютанта, пра трапяткія адносіны да выпакутаваных вобразаў... Бо цяжка паверыць, што Леанід Васільевіч Дранько-Майсюк, пазначаны "ў цітрах" як "рэжысёр" зборніка, падчас рэдагавання перманентна страчваў паэтычны слых ці/і мастацкі густ: "*Блакітная кветка заснула на снезе, // Прабітае сэрца на лютым абрэзе — Спакой*" ("Мроі"); "*Не заві мяне дзіўным, бо* ***сам ты заморскі экзот***" ("***Ты, што здрадзіў зямлі і радзіме..."). **Между протчым!!!**

Нягледзячы ні на што, крытыкі — народ трывушчы. У гэтым сэнсе не перастаю здзіўляцца, да чаго ўсё ж кволы стаў паэт. "*Я таксама памёр, // Бо пачуў слова // "НЕСАПРАЎДНАСЦЬ"*, — адкрывае таямніцу сваёй гібелі герой верша А. Кавалеўскага "Апошняе слова". "*Я — жаўнер на праклятай вайне, // ты — жаданая, // белая смерць мая*", — прызнаецца Янка Лайкоў, чый кніжны дэбют адбыўся ў 2003 годзе ("Вогнепаклоннік": Мн., "Мастацкая літаратура") і спарадзіў процьму водгукаў — добрых і розных (гл., напрыклад, № 6 "Дзеяслова" за 2003 год).

Калі ўсе паэты памруць гэтак жа хутка і калектыўна, як абяцаюць, на чыіх руках, вы думаеце, застанецца Паэзія?..

Што ж, такая ў **НАС** работа — show must go on!

Ірына ШАЎЛЯКОВА

Фота забяспечана аўтарам

Каляпарнаскія жарсці, ці Што такое паноптыкум?

На Сардыніі некалі расла трава, якая дужа перакрыўляла чалавечы твар. Адсюль сарданічны смех — зласлівы, з'едлівы. Ды ў нашы дні хтосьці тутэйшага, роднага блёкату аб'еўся. У гэтым пераконваешся і пасля азнаямлення з нататкай Андрэя Курэйчыка "Парнас у паноптыкуме", надрукаванай у "Белорусской газете" пад рубрыкай "Асабісты густ". Вядома, пра густы не спрачаюцца, але... Размова пра спектакль Сяргея Кавалёва "Тарас на Парнасе", пастаўлены ў Тэатры юнага гледача. Драматург Курэйчык п'есу калегі ацаніў на 2 (па 10-бальнай шкале!) і гэтае "нішто" змясціў у паноптыкум — музей незвычайных экспанатаў. Яго павага да чытачоў — у пытанні пасля назвы: "Што гэта?"

Аднак "зачапілі" не калятэатральныя звадкі, а выказванні Курэйчыка пра паэму "Тарас на Парнасе". "*Если Тарас — это национальный белорусский герой, а поэма — "визитка" нашей поэзии, — закручваецца інтрыга, — то белорусы — самая несчастная нация на планете, основными чертами которой являются слабохарактерность, лживость, похоть, отсутствие гордости и бесконечно холопская психология... Поэма, которая в любом другом государстве просто не попала бы в разряд высокой литературы, поскольку заведомо относится к маргинальным для XIX в. жанрам, у нас изучается в школьной программе. Поэма "Тарас на Парнасе" в позапрошлом веке выполняла такую же функцию в развлечении плебса, что и дешевые комиксы сейчас. Примитивный сатирическо-авантюрный сюжетец, пародирующий местечковое восприятие классицизма и полный пошлейших сцен, туповатый юмор, картинные герои, словно соревнующиеся за звание самого большого идиота... Раньше всю эту пошлость и нелепицу можно было списать на необразованность и низкий культурный уровень неизвестного автора...*". Які пафас, агломб, катэгарычнасць! Па Курэйчыку, паэма — "маргінальная", "прымітыўная", "пошлая", "недарэчная", створана малакультурным чалавекам. Тут мусіць быць нейкая "свая" логіка, "адметны" сэнс!

Адразу падалося, што гэта празмернае эстэцтва, ніцае арыгінальнічанне і бязглуздая прэтэнзія на эпатажнасць давялі хлопца да мастацкай слепаты. Ды не! Рухавік — ушчэмленае самалюбства, фанабэрыстасць і пыхлівыя амбіцыі. Кампраметацыя паэмы спатрэбілася, каб прынізіць канкурэнта на драматургічным Парнасе. "*Сергей Ковалев сделал из поэмы пьесу, щедро приумножив недостатки оригинального текста*", — рэзюміруе Курэйчык. Дарэчы, такія "паводзіны", подленькія інвектывы, трапна высмеяў "неадукаваны" аўтар "Тараса...". Не толькі пра Булгарына, але пра ўсіх пасквілянтаў радкі: "А не, дык дадушы ў газеце // Я й вас аблаю на ўвесь свет, // Як Гогаля ў прошлым леце...". Ці не таму Курэйчык так не любіць паэму, у якой ёсць і яго непрывабнае адлюстраванне?

Сурова, не прадбачачы, пажартаваў з Курэйчыкам аўтар іранічнай беларускай паэмы-прыпавесці. Ён прымусіў нашага сучасніка распісацца ў няздольнасці зразумець схаваную насмешку паэта, што, як Пікасо, маляваў свет не такім, якім бачыў, а такім, якім мысліў. У паэме сцвярджаецца процілеглае таму, што саматужны "крытык" здолеў у ёй убачыць. "Тарас..." не быў разлічаны на "плебейскага" чытача, чаму і з'яўляецца пацвярджэннем нататка. Аўтар празрыста даваў зразумець, што сённяшніх куміраў публікі, як і колішніх уладароў думак і лёсаў, можа чакаць вартая жалю доля. Скарыстаўшы канкрэтныя міфалагічныя вобразы, паэт гаварыў пра свае адносіны да літаратуры і перыпетый культурнага развіцця славянскіх народаў Расійскай імперыі. Ён алегарычна маляваў тагачасны Парнас і яго "дзеячаў".

Няма сэнсу спасылацца на аўтарытэты. "Тарас..." перакладзены на ўсе асноўныя еўрапейскія мовы. Сцэнічнасць яго тэксту была пацверджана яшчэ ў 1927 годзе, калі ўзнікла опера Аладава "Тарас на Парнасе" (лібрэта Дрэйзіна). А вось карціна нораваў у асяроддзі жрацоў Мельпамены, намаляваная віцебскім паэтам сярэдзіны XIX ст. Ялегіем Францішам Вулем (псеўданім Францішка Карафы-Корбута): "Сталага тэатра, дзе мы маглі б бачыць уласныя дагератыпы ў камедыі і вартыя прыклады ў драме, у нас няма. Заблудзіць калінікалі кампанія вандроўных актораў, якая гучна назавецца трупай драматычных артыстаў, пакажа, што ўмее і чаго не ўмее, не задаволіць ні нас, ні сябе, запазычыцца па вушы і па чуприну, перасварыцца паміж сабой і з публікай ды распаўзецца ў розныя бакі, наракаючы на горад, які не цэніць талентаў і пераважна наведвае Броза і Залмана (утрымальнікі віцебскіх шынкоў. — *І.З.*) з-за баваркі (засалоджаная гатаваная вада з малаком — *І.З.*) (і ў нас баварка, што за прагрэс!) і катлет, а не тэатр, дзе можна нечаму навучыцца ды, прынамсі, прыстойна прабавіць час. Зрэшты, гэта шчырая праўда, што більярд, напоі, катлеты і карты больш прывабныя для нас за дрэнную п'есу, якую іграюць у правінцыйным тэатрыку часцей вельмі пасрэдна і рэдка калі нішчавата. Таму не дзіва, што акторы, пакінутыя ўсімі, без гроша, жывуць і п'юць з гора ў крэдыт, пакуль не збанкрутуюць дарэшты і не ўцякуць з горада, й старанна абтросшы ад пылу свой абутак і адзенне, якія свецяць дзірамі".

Так, "працаўнікі" сцэны не толькі сёння, але і заўсёды ўмелі перасварыцца! Часы мяняюцца, а норавы застаюцца.

Вуль лічыцца адным з верагодных стваральнікаў "Тараса...", таму курэйчыкаўская "неадукаванасць" аўтара ўспрымаецца як кур'ёз. У паэме алімпійскія багі жывуць на Парнасе, адвольна змешваюцца імёны грэчаскага і рымскага пантэонаў. Матывіроўка — адлюстраванне абсурднасці таго, што адбываецца. Еўрапейскі тэатр да гэтага прыйдзе яшчэ не хутка. У "Тарасе..." адчуваецца ўплыў еўрапейскай паэзіі, у прыватнасці, папулярнага тады ў нас Генрыха Гейнэ. У яго вершах часта гаворыцца пра забытых антычных багоў, якія ператвараюцца ў звычайных людзей з будзённымі клопатамі. Скажам, Апалон, якога паводле міфалогіі суправаджалі музы, у Гейнэ — ашуканец, які "ў прытонах Амстэрдама // Дзевяць шлюх набраў прывабных // І як дзевяць муз іх возіць, // Апрануты Апалонам".

У сярэдзіне XIX ст., дзякуючы творчасці А. Пушкіна, М. Лермантава, М. Гогаля, зрэшты, і нашага земляка Ф. Булгарына, руская літаратура, папярэдне рэцыпіент, становіцца рэальным фактарам у культурнай Еўропе. У той час творчасць Тараса Шаўчэнкі набывае шырокую вядомасць, а Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч друкуе свае беларускія творы. Нарэшце, тады ўсе звярнулі ўвагу на селяніна. Вось чаму палясоўшчык Тарас трапляе на гару, якая сімвалізуе творчасць. Паэма нарадзілася ў Беларусі як іскры ад удару "маладой" усходнеславянскай літаратурнай цывілізацыі па "старой" еўрапейскай культурнай традыцыі. Эстэтычныя далягляды аўтара былі вельмі шырокімі. Ён не быў пестунком лёсу, які купаецца ў промнях славы. Тагачасныя ўмовы гарантавалі беларускаму паэту ў лепшым выпадку — нягоды, у горшым, як часта здаралася і як сталася з Вулем, — Сібір.

Перш чым намякаць, што "Тарас..." непатрэбны ў школьнай праграме, абвінавачваць аўтара ў нізкім культурным узроўні, прыбірацца ў строі ахоўніка "чысціні" нацыянальных герояў, ёсць сэнс самому напачатку засвоіць шэраг элементарных ісцін... Каб не быць смешным! Ва ўсякім разе, ні Дон Кіхот, імя якога сімвалізуе ў тым ліку адарванасць ад жыцця, ні Д'Артаньян, легкадумная і авантурная Папялушка са шпагай, не з'яўляюцца нацыянальнымі героямі іспанцаў і французаў. А інтэлектуал Курэйчык у запале сцвярджае адваротнае.

ТЮГаўскую пастаноўку "Тараса на Парнасе" крытыкуюць не ўпершыню. Трэба думаць, яна атрымалася. Увогуле, творчая зайздрасць — нядрэнная рэч, але калі яна выліваецца ў дробныя інвектывы, бяздоказныя пасквільныя допісы, становіцца сумна. На іх не варта было б звяртаць увагу, калі б сёння не развялося так шмат дзеячаў культуры, якія па дарозе на Парнас, па прыкладзе тарасаўскага Булгарына, так актыўна "працуюць" локцямі. Нязмушаная ўсмешка прыемней сарданічнага смеху.

P.S. У красавіку гэтага года выпала два юбілеі: 15 красавіка — 150 гадоў з часу ўзнікнення паэмы "Тарас на Парнасе", 21-га — 170 гадоў з дня нараджэння Францішка Карафы-Корбута.

Ігар ЗАПРУДСКІ
Фота Паўла ЭЗЕРЫНА

Асветнік і будзіцель

Вялікі Р. Ралан пісаў: "Каб надарыць святлом іншых, трэба насіць сонца ў сабе". Менавіта да кагорты такіх людзей адносіцца вучоны, літаратуразнаўца Ігнат Дварчанін. Прырода шчодра надзяліла яго талентамі. Гэты чалавек быў здольным паэтам, публіцыстам, выдаўцом, грамадскім дзеячам.

Ігнат Дварчанін нарадзіўся 8 чэрвеня 1895 года ў вёсцы Погіры Дзятлаўскага раёна ў сялянскай сям'і. Калі хлопчыку споўнілася сем гадоў, ён пайшоў у школу. Вучоба давалася надзвычай лёгка. Неўзабаве яго адаронасць заўважылі настаўнікі і параілі бацькам аддаць Ігната вучыцца далей — у Дзятлаўскую школу вышэйшай ступені, дзе рыхтавалі настаўнікаў.

Праз пэўны час І. Дварчанін паспяхова здаў экзамены і атрымаў накіраванне ў школу вёскі Хмяльніца Слонімскага раёна.

Вясной 1915 года Дварчаніна прызвалі на вайсковую службу. Тут Ігнат пазнаёміўся і пасябраваў з вядомымі рэвалюцыянерамі Аляксандрам Чарвяковым, Сымонам Рак-Міхайлоўскім, Іосіфам Дылам і іншымі.

Летам 1917 года Ігнат Дварчанін прыехаў у Мінск. Неўзабаве пачаў цесна супрацоўнічаць з газетай "Вольная Беларусь". Трэба адзначыць, што менавіта з гэтага часу яго жыццё і дзейнасць карэнным чынам змяніліся, напоўніліся пафасам нацыянальнага адраджэння. У канцы 1917 года Дварчанін выбіраецца дэлегатам Усебеларускага з'езда. Пасля нейкі час працаваў у газеце "Вольная Беларусь". Хутка яго запрасілі на работу ў Маскву, дзе прапанавалі пасаду сакратара культурна-асветніцкага аддзела Беларускага нацыянальнага камісарыята.

Крыху пазней у Маскве адбылася нарада настаўнікаў школ Беларусі. І. Дварчанін не застаўся, вядома, у баку ад гэтай важнай падзеі і прымаў самы актыўны ўдзел, выступіў з дакладам. Ён падкрэсліў усю неабходнасць вывучэння роднай мовы і літаратуры з тым, каб "народ беларускі пазнаў самога сябе і лічыў сябе не ніжэйшым пасярод іншых, а пачуваў сябе як роўны з роўнымі".

Летам 1919 года Ігната Дварчаніна накіроўваюць у Дзятлава на курсы настаўнікаў, каб той як след авалодаў польскай мовай. Дварчанін супрацоўляўся паланізацыі і неўзабаве паліцыя арыштавала яго за створаныя падпольныя беларускія курсы, драматычны гурток і нацыянальны хор. Былога настаўніка хутка схапілі і адправілі ў канцлагер у Беласток, адкуль ён уцёк. Пасля вызвалення Беларусі Чырвонай Арміяй ён выдатна падрыхтаваўся і экстэрнам здаў экзамены за курс сярэдняй школы ў Віленскай гімназіі. У Вільні І. Дварчанін выконваў розныя заданні беларускага нацыянальнага камітэта, беларускай школьнай рады, чытаў лекцыі па гісторыі Беларусі і інш.

У верасні 1921 года члены таварыства "Бацькаўшчына" выбралі І. Дварчаніна дэлегатам Беларускай нацыянальна-палітычнай канферэнцыі, якую вырашылі правесці ў Празе. Пасля канферэнцыі яго залічылі студэнтам Пражскага універсітэта. У 1924 годзе Ігнат Дварчанін стварыў у Празе студэнцкую арганізацыю "незалежных сацыялістаў".

Усё сваё кароткае, але яркае, палымянае жыццё, якое абарвалася трагічна 8 снежня 1937 года, Ігнат Дварчанін змагаўся за свабодную, вольную Беларусь. Але імя нашага знакамітага земляка было, па сутнасці, забыта. Аднак у апошнія гады творчасць, дакументы і матэрыялы яго дзейнасці сталі прадметам навуковых даследаванняў.

У выдавецтве "Навука і тэхніка" выйшла кніга Ігната Дварчаніна "Францішак Скарына як культурны дзеяч і гуманіст на беларускай ніве", што з'яўляецца дысертацыяй, якую ён напісаў і абараніў у Карлавым універсітэце ў Празе. Гэта ў беларускім літаратуразнаўстве — першае даследаванне дзейнасці і светапогляду Ф. Скарыны. Зразумела, за гады, якія

мінулі з часу абароны дысертацыі, скарынаназнаўства зрабіла пэўныя крокі наперад.

Дарэчы, раздзеленыя стагоддзямі, гістарычныя лёсы Скарыны і Дварчаніна перакрыжаваліся. Асветнікі не былі запатрабаванымі сваёй Айчынай, былі вымушаны пераўтвараць у жыццё духоўны і інтэлектуальны набытак у Празе. Ігната Дварчаніна, як і Ф. Скарыну, можна ў поўным сэнсе гэтага слова назваць будзіцелем, адраджэнцам. Дзве гэтыя ўнікальныя асобы зведалі спаўна ў жыцці беднасць і пасля занядбанне сваёй спадчыны і свайго імя. І як Дварчанін вяртаў беларускаму народу напаўзабытага Скарыну, так і Скарына абавязвае даследчыкаў належным чынам прааналізаваць напісанае пра яго, адкрывае беларусам амаль невядомага Дварчаніна. Розныя яны, вядома, па велічы зробленага, але, відаць, роўныя ў пакутным служэнні роднай Беларусі.

Іосіф ЗАЯЦ

Вадзім КОРАНЬ

* * *

Хто вінаваты,
Што стачылі страты
І яву й сон,
Якім няма
Даверу,
Што на душы
З'явіліся стыгматы
І кроў з іх
Крапае,
Як вершы на паперу?

Абложыць ноч
І дня ўжо не настане
Пакутнай,
І знясіленай душы.
Яна чакала
Вечнага кахання.
А вечнае –
Сканала на крыжы...

* * *

Лёд на вуснах.
Словы змерзлі –
Не пацалуюць
Вершамі
Паперу...

Ноч

Зоркі за аблокамі схаваліся,
Адзінота ў вусны цалуе.
Я паганскаму богу каюся,
Ды наўрад ці мяне ён чуе.

Не спяшаўся ніколі я ў рай,
Ды і ў пекла зусім не хацелася,
А не скажа ніхто: выбірай,
Што ты хочаш –
ці травень, ці верасень?

Вось рамонкі на рэшітках сцяны.
І віном перапоўнены кубак...
Груганы пазляталіся ў сны,
Каб вярнуцца з крывёю на дзюбах.

* * *

Ніколі не плачце
над страшнымі снамі,
А будзеце плакаць, то я вас малю,
Хай капаюць слёзы ў сухую зямлю –
Там вырастуць кветкі
для вашае мамы...

* * *

Пацалаваць цнатлівасць
Адважыўся –
Памерла
Цнатлівасць.

* * *

Доўгачаканымі словамі
Па электроннай пошце
Дакрануся да вуснаў
Тваіх
І згублюся,
Звечарэлым
Сонцам барвовым
Ападу
Ў кубак з чорнай кавай
На тваім
Стале...

Усё застыла
Змярцвелаю
Формай...

Цяпер проста
Націсні
Delete...

Васіль РАГАЎЦОЎ

Імгненні

* * *

Першы снег.
Першая ўсмешка дзіцяці.
Імгненне таемнай чысціні.

* * *

Яловыя лапкі на дарозе...
Сірацеюць людзі.
Сірацее лес.

* * *

Збываюцца мары адных.
Праўдзяцца праклёны другіх.
І ўсе па-свойму
шчаслівыя.

* * *

Ніколі не стане
блізкім чужое,
калі счужынела
сваё.

* * *

Кожнаму мроіцца сваё:
каму — вераб'іная ноч,
а каму — варфаламееўская.

* * *

Адзінокі стажок на ўзлеску.
А на ім — бусел з бусліхаю.
Ад клёкату
замірае наваколле.

* * *

Нялёгка і святарам:
і за чужыя грахі просяць літасці,
і за свае пакутуюць.

* * *

У царкве.
Адны моляцца —
просяць паратунку,
другія замольваюць
свае грахі,
а трэція —
стаяць моўчкі.
З заплаканымі свечкамі.

* * *

Спыталіся ў заможніка:
"Што цяжэй: нарадзіцца
ці памерці?"
І той адказаў: "Жыць".

* * *

Нараджацца, як і паміраць,
можна аднойчы,
а здраджваць —
ўсё жыццё.

* * *

Нехта
раз саграшыў —
і ўсё жыццё каецца.
А ёсць такія:
раз пакаяліся —
і ўсё жыццё грашаць.

* * *

Хоць раз у жыцці
здзівіўся —
перад скананнем:
няўжо ўсё?

* * *

Сумленне, як і зайздрасці,
не купіш і не пазычыш.
Яго можна толькі
размяняць.

* * *

Нельга ўвайсці
ў адну раку двойчы.
А мне — удалося.
У раку маленства.
У мроях.

* * *

Адны цешаць сябе
будучыняй,
другія ўздыхаюць
па мінулым.
А ён слухае,
як вуркочуць
голуб з галубкаю —
і светла ўсміхаецца.

* * *

А некаторыя
і жыццё пражывуць —
што поле пяройдуць.
Ні радасці не зведаюць,
ні пакут.

Іван КАПЫЛОВІЧ

* * *

Напоўню ветразі свае
Я ветрам-чарадзеем,
І мая лодка паплыве
Да вострава Надзеі.

На востраве, дзе слёзы,
Бываў ужо не раз.
Сумуюць там бярозы
І зажурыўся час.

На востраве далёкім
Жыве мая надзея.
Туды і гоніць лодку
Вятрыска чарадзейны.

* * *

Няблізкая дарога
І думак цэлы рой.
І ціхая трывога
Ступае ўслед за мной.

Бялюткія бярозы
Паўсталі на шляху.
Гляджу на іх, і слёзаў
Спыніць я не магу.

Мне дужа адзінока
Ў душы маёй палын...
Дарогаю далёкай
Я плачу, я адзін.

* * *

Вільготнымі пахне імхамі,
Збівае дыханне багун.
Звярынымі йду я слядамі
Туды, дзе начуе Лясун.

Зязюля кувае, прарочыць
Мне штосьці пра будучы лёс.
Сава ж як заплача уночы —
Адразу па скуры мароз.

Спавітая сцежка карэннем
Губляецца недзе ў траве.
Я веру —
Лясун мяне стрэне
І распавядзе, як жыве.

* * *

Па Прыпяці вясновай
Байдарачнік вяслуе,
На беразе высокім
Услед яму гляджу я.
Імклівая байдарка,
Блакітнае вясло,
Рака гайдае хмарку —
Птушынае крыло.

На беразе другім —
Ракіты у вадзе,
Усплёск вясла, кругі —
Ў мой бок байдарка йдзе.

Байдарачнік-вясляр
Ўвесь аддаецца плыні,
Ўсміхнецца ён пасля —
Вясло калі астыне.

Фота В. КАВАЛЁВА

Нерэалізаваныя шанцы

узроставая фантазія

Юрась НЕРАТОК

Уводзіны

Так атрымалася, што я памёр. Не тое каб неспадзявана, але раптоўна неяк. Ішоў сабе паціху, "маторчык" перабоі даваў, як звычайна... А потым — ці то "пых", ці то "кэх". У галаве ўспыхнула зялёным, памутнела ўвобмірг, ледзь паспеў да сцяны нейкага будынка спінай прыхінуцца. І адразу споўз, куртку тынкам абдзёр. Горад вялікі — каго хто цікавіць? — і першы, хто звярнуў на мяне ўвагу, паляпваў па нежывых ужо шчоках. Хто сумку маю спёр (смех, дый годзе: прадуктаў на дзесятку, а іншае — асабістае, для ўсіх астатніх, апроч мяне, некаштоўнае), не заўважыў, бо заняты быў выключна пераходным працэсам. Грошы з кішэні (таксама дробязь) — узялі гіпакраты-эскулапы з "хуткай". Няхай сабе: мне не трэба, радні вяртаць — сябе прынізіць і іх таксама. Але ў сумцы пашпарт ляжаў. І з-за таго цуцыка, што яе падняў, прыйшлося тыдзень у моргу неапазнаным кантавацца. Калі не лічыць нумарка на правай назе. Каму мяне толькі не прад'яўлялі...

Усё гэта была мітусня, маёй увагі не вартая. Целам задаволены, калі яно падабаецца. Але ў жыцці заўсёды так атрымліваецца, што нейкая нездаволенасць да яго увесь час прысутнічае. То маленькі і шчуплы, то прышчы твар абсыплюць, то чырванее без п'янкі, то жывот выкаціцца за рэмень, то плех з вышыні мушынага палёту выявіцца. А далей — стары, нягеглы і нямоглы. І, як раней, нікому не патрэбны. Толькі адчуваеш непатрэбнасць вастрэй.

Узненавідзець можна сваё цела, не тое каб не звяртаць увагі! А на фінішы цікавасці да яго не больш, чым да парванай завэдзганай сарочкі, якую і па часе нашэння і па фактычным зносе прысудзілі да спісання ва ўтыль. Хоць і крыўдна.

Душа — зусім іншае, яна заўсёды ўладальніку падабаецца. Бо нябачная. Як ты яе разгледзіш знутры — яна са свядомасцю ў адной калысцы гушкаецца і ў адну труну кладзецца. А як разыдуцца — бяда: цяжка сярод людзей жыць! І для астатніх твая душа нябачная, таму што схаваная. А вось Усявышні бачыць і лёсы душ нашых грэшных безапеляцыйна вырашае.

Наконт бессмяротнасці душы нічога не скажу, але што пасля смерці ў пазачассе трапляеш — дакладна. Як гэта — растлумачыць немагчыма, самому разумець трэба. Узяць боль: немаўля, пакуль не спатыкнецца, нічога не баіцца; ці як апельсін: з чым яго параўнаеш, апроч апельсіна?

Рэлігіі зямныя рознае кажуць пра замагільнае жыццё (дарэчы, чаму "замагільнае"? — у мяне ад смерці да могілак дзесяць дзён прайшло!), але ўсе яны няпэўныя ў адным: у спробе невытлумачальнае жывому чалавечай мовай у свядомасць увесці. Цяжка. Асабліва калі сам не разумееш... Ну, як той апельсін, калі яго на свае вочы не бачыў... І спосабу іншага няма, зноў жа...

Завязка

— Ты святы Якаў?

— Высока скочыў, нехрысць. Звычайна Пятром называюць. А сапраўднае імя маё ўсё роўна не вымавіш: непадуладнае яно чалавеку. Вы для мяне, як для вас сабакі: уся ваша размова — "гыр!" ды "гаў!"

— Навошта ж табе, такому сур'ёзнаму, гэткі клопат?

— Работа такая. Агенцтва "Нерэалізаваныя шанцы". "Нявыкарыстаныя магчымасці", каб лепш зразумеў. Карацей, апельсін — гэта бульбіна з тоўстай аранжавай лушпінай, якую можна здымаць рукамі, а не нажом.

— Я табе нешта павінен плаціць?

— Прывучылі вас там... Заплаціў ужо. Карацей, апельсін — гэта яблык, які падзелены па дольках да таго, як ты за яго ўзяўся...

— Дык хто каму патрэбны?

— Не зразумеў?! Я табе, канечне! Жыццё чалавечае — праца цяжкая. І калі на нуль выйшаў — лічы, што адолеў яго паспяхова. Занесла не туды, разгубіўся, напартачыў, празяваў — перайграць можна. Узнёсся пры жыцці, вышэй за яго стаў — можа, нават у такім "агенцтве", як я, з такімі мудакамі, як ты, базарыць будзеш. Не ў тым сэнсе, што пастысповедзі, малітвы-намазы, хоць і гэта дысцыплінуе... Карацей, як апельсін: той жа зямны шар, толькі ў сто мільёнаў разоў меншы.

— І як ты паспяваеш з усімі намі працаваць?

— Лічы, што мяне можа быць столькі копій, колькі спатрэбіцца. І кожны з кожным яго мовай размаўляе. Карацей, апельсін — той жа кавун, але калі кінуць яго долу — не трэсне.

— І навошта я табе?

— Не ты — мне, а я табе, ёлупень!

Сляпуча ўспыхнула яркае святло. Нічога, апроч святла. Металічным рэхам загрымеў голас агента "Нерэалізаваных шанцаў":

— Адказваць на мае пытанні выразна і дакладна! Ці засталіся на Зямлі незавершаныя справы?

— Дробязі ўсякія... Кавалак варанага мяса ў лядоўні, хіба што...

— Ці хацеў бы перайграць жыццё?

— Няма сэнсу... Не. Да таго ж і прыйду.

— Ці няма шкадавання аб выпадках, калі бачыў, што твае паводзіны могуць нешта кардынальна змяніць, але так і не наважыўся на ўчынак?

— Не наважыўся, то і не трэба было. Не.

— Упэўнены?

— Зразумела, не, хоць ты мяне і ёлупнем назваў.

— Я пракручу табе пару выпадкаў з твайго жыцця. На мой выбар. Яшчэ раз перажывеш-перагледзеш, а пасля вырашым, што з табой рабіць.

— І як ты здолееш пракруціць?

— Апельсін — той жа тэнісны мячык, але ядомы. Ну, назола...

Эпізод першы

Мне дваццаць гадоў. Прышчаваты трэцякурснік, які ведае смак тытуню, гарэлкі і жанчыны. Толькі другое і трэцяе — заўсёды асобна, так склалася.

Электрычка метро; неабавязковы і няспешны візіт у процілеглы канец горада з інтэрната, які паспеў стаць родным домам; прымітыўная крыва-крыжовая чырвона-сіняя схема станцый; адлюстраванне ў шкле вагона ўласнага твару, якое выклікае прыкрасць, і ўласнай постаці, што выклікае ганарлівасць. Менавіта так, ганарлівасць.

Сарамлівасць мяжуе з развязнасцю. "Rus in urbe", здаецца? Зрэшты, мы тэхнары, нас вучаць не таму. За плячыма пяць сесій, медыум, у бліжняй перспектыве — шостая. Красавік літасціва дазволіў скінуць зімовае паліто і апрануць вятроўку, але пакуль забараніў здымаць світэр. Стрыжаная, каб дагадзіць падпалкоўнікам ваеннай кафедры, галава загружана напалову — ідэальны стан для вырашэння любых праблем!

Ссівела-лысаваты мужчына ў чорных шнураваных чаравіках, шэрым палітоне, карычневым касцюме і белай з вузкімі жоўтымі палоскамі кашулі, з гадзіннікам "Луч" на чорным скураным раменьчыку. Разгадвае красворд у "Вячэрняй газеце". Дзюбка алоўка — на васемнаццатым пытанні: "старадаўняя руская чаша з ручкай". Зрок — адзінка: зазіраю ў клетачкі. Шэсць літар. "Ендова!" Што за "ендова" — не ведаю і не бачыў, не нашанскае таму што. Але толькі "ендова", з "кувшина" ці "кринки" ў крыжаванках не п'юць. Добра, сам разбярэцца. Няхай кожны грызе свой батон.

Жанчына, якая сядзіць побач з разгадчыкам крыжаванкі, разглядае мяне. Даўнавата глядзіць — позірк быццам бы прыцёрся да майго аблічча. Не пільна, не назойліва. Не вывучае, не аналізуе. Толькі пазірае.

Мы знаёмыя, візаві? У мяне няма такіх знаёмых. Я — хлопец з вёскі. Ёй трыццаць—трыццаць пяць гадоў. Кола маіх знаёмцаў у сталіцы акрэслена канкрэтна: выкладчыцы, бібліятэкаркі, кватэрныя гаспадыні, персанал інтэрната. А ў вёсцы я пакуль ведаю па імёнах нават першакласнікаў.

У яе мяккія доўгія валасы, якія светлымі пасмамі сцякаюць на спіну і, падзеленыя плячамі, на грудзі. Гэткая Брыльска-Пугачова! Шырокія, цёплыя, разумныя вочы не выяўляюць, а канстатуюць адзіноту і жаданне пазбавіцца ад яе.

Такая жанчына не можа быць адзінокай — занадта ненатуральна. Хіба што часам яна сама гэтага жадае. Але не сёння. Магчыма, яна разышлася са сваім выбраннікам. Так, менавіта "выбраннікам". Яна сама выбірае.

Муж, гуж, вуж — словы якія блазенскія! Няма ў яе мужа і дзяцей няма. Іначай чаму пальчыкі гладкія, пялегаваныя, а пазногцікі доўгія, лакіраваныя? А дзе ваша гаспадарчая торба, мадам? У вас толькі маленькая касметычка...

Такая жанчына выбірае сама. Але заўсёды рызыкуе тым, што выбраннік праігнаруе выбар. Ці возьме толькі ласы кавалак. І адмовіцца, калі ласае прыесца. Ён, здаецца, адмовіўся. Не, напрасткі такім жанчынам не адмаўляюць: ён доўга лавіраваў паміж крыгамі жыццёвых абставін і ўрэшце прапанаваў загадзя непрымальныя ўмовы. Так яно і было.

Яна не вабіць і не прапануе сябе — толькі інфармуе.

Я вольны ад абавязкаў і маралі. У мяне ёсць час і нават нейкія грошы. Што перашкаджае? Шкарпэткі, якія не мяняў з тыдзень?

...Дзверы вагона адчыняюцца, і я зноў выходжу, каб вырашаць неабавязковыя і няспешныя пытанні.

А яна зноў ад'язджае назаўсёды.

Эпізод другі

Мне сорак гадоў. Лысаваты мужчына, кіраўнік невялікага падраздзялення на адным са шматлікіх прадпрыемстваў. Чалавек, які ведае кошт жаночай любові і мужчынскаму сяброўству. Так склалася: няма мужчынскай любові і жаночага сяброўства.

Тралейбусны прыпынак; адчуванне стомленай задаволенасці ад выкананай праграмы-мінімум; да дома з паўгадзіны хады і столькі ж язды з улікам чакання транспарту.

Камерцыйныя кіёскі з таварам хуткага абарачэння і гарантаванага збыту. Як там у Маркса: "грошы-тавар-навар"?

Шкло шапіка "Саюздруку" адлюстроўвае коратка пастрыжаную галаву і загарэлы твар. Ліпень пераканаў, што майка без рукавоў — той самы кампраміс на мяжы сацыяльнага статусу і фізічнага камфорту.

Трыццацігадовы п'янавата-нахабны халабай ходзіць з адкаркаванай і адпітай ім бутэлькай піва — назойліва прапануе яе кожнаму дапіць. Ты не там банкуеш, хлопча, вярніся ў рэальнасць!

Каб пазбегнуць кантакту з трыццацігадовым, сам бяру піва.

...Стокілаграмовая цётухна вызваляе ценявое месца ў прыпыначным павільёне, бо імкнецца запоўніць сабой прастору "дваццаць дзевятага". Ляці, ластаўка цяжкахвостая...

— Не падкажаце, як праехаць да гарадскога вадасховішча?

Студэнтачка, а можа, абітурыентачка; гадкоў васемнаццаць—дваццаць; закамуфліраваныя прышчыкі. Зрок — адзінка. У напаўраскрытым пакеце — набор для паўнацэннага адпачынку: ад шырокага ручніка да бутэлечкі прахаладжальнага напою.

У яе цёмныя кароткія валасы, сціплая ўсмешка, мяккі, адначасова ўпэўнены і трошкі мітуслівы голас. Гэткая Алсу-Лаліта!

...Не ведае, дзе гарадское вадасховішча? "Rus in urbe". А дзе ж кавалер, мадэмуазель? Пасварыліся ці займець не паспела? А я хто для яе — "папік"?

Падрабязна і ветліва, як заведзена ў нашым горадзе, тлумачу студэнтачцы, на чым ехаць і дзе выйсці.

Гэта мой горад — заўважаю на прыпынку знаёмага журналіста, прашу прабачэння ў мадэмуазелі, падыходжу да яго. Прапаную пачаставацца півам. Ён адмаўляецца. А як жа — кожны доіць сваю кароўку!

Пад'язджае "трыццаць сёмы". Пляскаю па плячы знаёмага і чую галасок студэнткі: "Да пабачэння!"

Трусы-сямейнікі — не самы гожы гардэроб для адпачынку з незнаёмай дзяўчынай на зялёным мурагу каля вадаёма. А мітусіцца не хочацца. Лянотна...

Развязка

— І гэтыя эпізоды ты не захацеў бы перайначыць?!

— Чаму не? Але ты не даў магчымасці, не папярэдзіў, нічога не змяніў...

— Твае праблемы. Трэба было ўцяміць, што ўсё залежыць ад цябе. Першы раз празяваў і другі — задрамаў. Я сваю работу закончыў. Цяпер ты і на самай справе памёр-памёр-памёр-памёр...

Меднае рэха ад голасу "агента" сціхае, святло гасне назаўсёды. Толькі марудна, вельмі марудна. Магчыма, канчаткова яно пагасне праз сто ці тысячу гадоў. Зрэшты, я ж казаў: тут — пазачассе. Ну, як той апельсін...

Арт-пацеркі

Мінскі дзяржаўны каледж мастацтваў святкуе сваё 30-годдзе. А яго дырэктару — заслужанаму дзеячу культуры Беларусі Уладзіміру Тарану — нядаўна споўнілася 70. Шаноўны юбіляр узначальвае гэтую навучальную ўстанову з часу заснавання. Адміністрацыйныя абавязкі; педагагічны чын у галіне народнай інструментальнай музыкі; праца ў конкурсных журы ... У чым сакрэт яго нястомнасці? "Нельга быць старым. Не гады, а душа павінны быць мерай чалавечай асобы. Я ўвесь час у працы, у творчасці — і на ўсмешцы", — прызнаецца У. Таран.

Конкурс маладых эстрадных спевакоў, як заўсёды, будзе ў цэнтры падзей Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар" у Віцебску". Сёлета Беларусь будуць прадстаўляць ужо вядомыя нашым аматарам гэтага жанру Гюнеш Абасава і Паліна Смолава.

Беларускае таварыства сучаснай музыкі ладзіць заключны канцэрт сезона. Ён адбудзецца 4 ліпеня ў сталічнай Зале камернай музыкі, што на Залатой Горцы. Слухачы маюць магчымасць (прычым, бясплатную!) пазнаёміцца, напрыклад, з малавядомай у нас музыкай Хольста, ды найперш — з новымі творамі сучасных беларускіх кампазітараў Уладзіміра Каральчука, Дзмітрыя Лыбіна, Аляксандра Літвіноўскага, Віктара Кісцяня... Інтрыгуе і склад выканаўцаў, сярод якіх — беларускі тубіст "нумар адзін" Раман Дакуніхін ды мастацкі кіраўнік гурта старадаўняй музыкі "Брэвіс" Павел Сурагін.

Міжнародны кінафестываль "Залаты Віцязь", што прайшоў у Чэлябінску і прадставіў работы з 25 краін, стаўся плённым для беларускіх творцаў: наша дэлегацыя прывезла дадому шэраг дыпломаў і нават прызы-статуэткі. "Залатым Віцязем" адзначана стужка рэжысёра-дакументаліста Галіны Адамовіч "Божа мой", у яе калегі Віктара Аслюка — "срэбра" за фільм "Султан з Адрынкі". Абодва прызёры прадставяць Беларусь на Міжнародным кінафестывалі ў Карлавых Варах, які адкрываецца сёння, 1 ліпеня. Конкурснымі лаўрамі ў розных намінацыях таксама ганараваныя кінагісторыя для дзяцей "Маленькія ўцекачы" Рэнаты Грыцковай, кароткаметражка Людмілы Дуброўскай "Дзікія звяры свету", анімацыйная стужка "Легенда пра ледзі Гадзіву" Ірыны Кадзюковай. Дыпломамі ўзнагароджаны работа рэжысёра Аляксандра Карпава "Палітра памяці" (Белвідэацэнтр), анімацыя "Рэактыўнае парася" Аляксандра Ленкіна, "Дунечка" Аляксандра Яфрэмава.

С.ВЕТКА

Фота забяспечана аўтарам

Сёлетнія Дні культуры Швецыі ў Беларусі атрымаліся вельмі дынамічнымі. Гэта звязана не толькі з даволі вялікай колькасцю імпрэз за кароткі тэрмін, але і з тым, што дзве фотавыставы шведскіх аўтараў і прэм'ерны фільм так ці інакш звязаныя з рухам.

ШВЕДСКАЕ «нашэсце»

Актыўная і размаітая прэзентацыя на Беларусі культуры Швецыі менавіта ў летні час звязана са святкаваннем 6 чэрвеня Дня шведскага сцяга. Асноўнымі падзеямі Дзён сталіся адкрыццё дзвюх фотавыстаў — "Праездам" Георга Однэра і "У пошуках Алі Булалы" Лізы Селін, прэм'ерны паказ фільма Яна Труэля "Прысутнасць" ды фестываль шведскага кіно ў Мінску і Гродне.

Напачатку адбылася творчая сустрэча з фатографамі і кінарэжысёрам. Госці распавядалі пра свой творчы шлях, адказвалі на шматлікія пытанні. Ліза Селін патлумачыла, што сваёй фотавыставай, прысвечанай вядомаму скейтбардзісту, яна спрабавала паказаць гледачам дух свабоды гэтага чалавека і яго асяроддзя, адпаведны стыль жыцця. Да таго ж, як зазначыла аўтарка працы, чорна-белыя фотаздымкі закліканы падкрэсліць дакументальнасць экспазіцыі. Ян Труэль, "фатограф, які рэжысіруе" (так ён сам сябе вызначыў), распавёў пра сваё захапленне спачатку фатаграфіяй, а потым і кіно. "Я прыйшоў да кіно менавіта праз вобраз, а не праз літаратуру, як гэта часта здараецца". Таму, напэўна, у прадстаўленым фільме ён так удала паказаў творчую асобу свайго сябра і калегі Георга Однэра.

Гэтая надзвычай цікавая дакументальная работа была паказана ў сталічным кінатэатры "Перамога". Добрае ўзаемаразуменне героя і рэжысёра ўвасобілася ў тым, што ў стужцы вельмі натуральна спалучыліся кіна- і фотакамеры. Рэчы то жылі ў кіно, то праз момант рабіліся ўжо фотаздымкамі. Таму фільм дае

магчымасць напоўніцу адчуць розніцу паміж двума падобнымі, але разам з тым палярнымі відамі мастацтва. Аднак падчас творчай сустрэчы Георг Однэр са свайго боку ўсё ж такі падкрэсліў перавагу фота над кіно: "Фотаздымкі маўчаць. Можна самому ўявіць адпаведны ім гук. Гэта вельмі важна, бо сёння ўсё часта ператвараецца проста ў няспынны гул".

Біяграфічныя звесткі ў сюжэце паказанага фільма змяняюцца тлумачэннямі фатографа сваёй тэхнікі здымкаў, творчай задумкі, што ў сваю чаргу саступае месца філасофскім разважанням. Маці Георга была руская, таму асаблівую цікаўнасць да Расіі перанёс фатограф праз усё жыццё. Разам з бацькамі ён стаў адным з першых турыстаў у СССР пасля вайны. Шмат здымкаў захавалася з тых часоў.

Хлопчыкам ён моцна захапляўся барабанамі, а гэта потым адлюстравалася ў яго новым хобі, якое зрабілася і прафесіяй: рэч у тым, што Георг Однэр граў юнаком у адным з лепшых джазавых гуртоў Швецыі. А затым выпадкова, дзякуючы запрашэнню знаёмага, трапіў у ЗША і стаў вучнем легендарнага фатографа ў свеце моды — Рычарда Аведона. У кантэксце фільма натуральна гучаць словы Однэра: "Кампазіцыя — гэта рытм". Яго фотаздымкі сапраўды вельмі дынамічныя, жывыя. Гэта адбітак імгнення, як кажа сам аўтар, сродак "пабачыць час". Адно імгненне бясконца змяняе іншае, і такім чынам яно робіцца адпраўным пунктам для вечнасці. Жыццё чалавека таксама — імгненне. Простыя сітуацыі паўстаюць перад гледачом у новым святле. Яны пранікаюць углыб цябе, быццам добрыя вершы, бо на іх адлюстраваны людскія пачуцці, а "пачуцці — гэта і ёсць паэзія". Сапраўды, "фатаграфія — не проста капіраванне рэчаіснасці, гэта найперш перадача пачуццяў". Але яны нават не проста ўдала перададзеныя. Глядач не толькі пазірае на партрэт чалавека, праз яго ён углядаецца ўглыб сваёй душы. Менавіта гэтага імкнецца дасягнуць фатограф. "Калі б мастацтва не існавала, людзі б не ведалі нічога пра сябе". Гэтая думка падаецца ўдалым падсумаваннем зместу стужкі, паказу якой беларускія гледачы доўга апладзіравалі...

Увогуле, імпрэзы Дзён — як своеасаблівыя майстар-класы, пасля іх з'яўляецца непераадольнае жаданне выправіцца са старэнькім "Зенітам" насустрач жыццю, каб пакінуць яго адбіткі на чорна-белай стужцы. І за гэта нашым шведскім гасцям вялікі дзякуй!

Дарэчы, выстава Георга Однэра "Праездам" у дзвюх частках працавала ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва да 20 чэрвеня і ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі да 30 чэрвеня. Выстава Лізы Селін "У пошуках Алі Булалы" размясцілася таксама да 30 чэрвеня ў галерэі візуальных мастацтваў NOVA Цэнтральнай бібліятэкі імя Янкі Купалы. Фестываль шведскіх фільмаў праходзіў з 7 па 17 чэрвеня ў кінатэатры "Перамога". Варта было наведаць!

Ларыса ДАРАШЭНКА

Фота забяспечана аўтарам

У музычным тэатры святочна

Указам Прэзідэнта краіны заслужаны артыст Беларусі Аляксей Ісаеў — саліст і дырэктар Беларускага дзяржаўнага музычнага тэатра — узнагароджаны медалём Францыска Скарыны. Сёлета гэты знаны дзеяч мастацтваў адзначыў сваё 50-годдзе. У тэатры, які ён узначальвае, завяршаюцца маштабныя рамонтныя работы. Артысты ўжо атрымалі абноўленыя камфартабельныя грымёркі, а гледачы ацанілі раскошнае афармленне кулуараў, дзе ўсё цяпер ззяе ў бляску вялікіх — на ўсю сцяну — люстэркаў. Закрыццё сезона мяркуецца ўпрыгожыць прэм'ерай аперэты І.Кальмана "Баядэра". Яе паказ мае адбыцца праз пару тыдняў.

С.Б.

Фота забяспечана аўтарам

На здымках Л Кузьміцкая і А. Ісаеў у аперэце "Цыганскі барон".

Нефармат...

У мінскім клубе "Мерыдыян" адбыўся фестываль авангарднага мастацтва "Нефармат". У пэўнай ступені такія імпрэзы зрабіліся традыцыйнымі. Калі яшчэ некалькі гадоў таму сама з'ява "перформанс" выклікала шок, дык сёння ўжо можна казаць пра пэўную посттрадыцыйнасць авангарда ці поставангарда. Так, паводле аналогіі ўспамінаюцца шматлікія мерапрыемствы, якія ладзілі бумбамлітаўцы, навафронтаўцы, другафронтаўцы, пчолы, сатурніяне, асацыяцысты... Пералік можна працягваць доўга.

Прыгадаць можна яшчэ "Арт-прагноз-96", які ладзіў Алесь Пушкін у сваёй незалежнай Віцебскай галерэі, дзе шырока былі праведзены эксперыменты з малюнкам, рухам, танцам, скульптурай. Варта згадаць некалькі праектаў "Сіні перац" Леаніда Нарушэвіча (акцэнт на эксперыментальнай музыцы, тэксце, мультыплікацыі). А яшчэ — шматлікія акцыі і перформансы, якія перыядычна ладзіліся (ладзяцца) нашымі суайчыннікамі ў розных краінах свету на ўзроўні сучасных еўрапейскіх эстэтычных запатрабаванняў.

У праграме "Нефармата" адбыўся сінтэз "электроннага шуму", перформанса, тэксту. Выступалі "Спецбрыгада афрыканскіх братоў" (Зміцера Вішнёва), "Тэатр псіхічнай неўраўнаважанасці" (Ілля Сін), перформ-гурт "Адсутнасць" (Алесь Туровіч), эксперыментальныя музычныя гурты. Многія ўдзельнікі сваім знешнім выглядам і паводзінамі ўтваралі самадастатковы мастацкі твор. Паводле меркаванняў крытыка Радзіёна Раскольнікава, "музычны, паэтычны і тэатральны авангард, што дэманстраваўся ў межах фестывалю, быў сапраўдным і безапеляцыйным "нефарматам" ("Белорусская газета" № 487).

Варта чакаць новых праектаў і фестываляў нетрадыцыйнай творчасці. А пяты па ліку "Нефармат" стаўся яшчэ адной цаглінкай у мур айчыннага посттрадыцыйнага мастацтва, яшчэ адным крокам у напрамку асэнсавання авангарда...

Алесь ГАНЕЦКІ

Афіша колеру хакі

Нам прапануюць, мы выбіраем і ацэньваем. Сёння драматычныя тэатры прапануюць гледачам на выбар разнастайныя спектаклі: ад класікі да сучаснай драматургіі. І, канечне, у сёлетнім сезоне кожны калектыў не абмінуў тэму Вялікай Айчыннай вайны, удзяліў сціплае месца на сваёй сцэне. А сціплае таму, што ў кожным тэатры — па адным спектаклі на гэтую тэму. Але ж і за гэта шчыра падзякуем і глянем на сталічныя афішы.

У Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы з мая 2004 года ідзе спектакль, прэм'еру якога "ЛіМ" рэцэнзаваў, — "Балада пра каханне" паводле аповесці В. Быкава "Альпійская балада". Жанр спектакля, пастаўленага рэжысёрам У.Савіцкім, пазначаны як драматычная паэма ў адной дзеі. У ролях занятыя Г. Хітрык (Джулія Навэлі) і Р. Падаляка (Іван Цярэшка). Гэты творчы дуэт працуе на сцэне праўдзіва і пераканальна. Маладыя артысты заўсёды падтрымліваюць адно аднаго, бо існаваць паасобку ім увогуле немагчыма. Іх аб'ядноўвае агульная задача: данесці да гледача тое, што вайна — жудасная рэч, якую нельга дапускаць на зямлі, што чалавек нарадзіўся на свет, каб зведаць каханне, а не дзеля забойства. Рэжысёр У.Савіцкі ўзяў за аснову спектакля галоўныя і самыя яркія эпізоды аповесці. А для апісання прыроды, жыцця ў канцлагеры і г.д. знайшоў вобразнае тэатральнае вырашэнне. Напрыклад, горы, людзі — гэта зэдлікі, з іх жа героі спектакля вырабляюць фашысцкую свастыку. А праменні сонца — сафіты, якія, адпаведна дзеі, апускаюцца і падымаюцца.

Сюжэт аповесці востры і непрадказальны. Галоўныя героі пастаўлены ў жорсткія ўмовы жыцця, нават не жыцця, а існавання. На іх вядзецца паляванне, як на дзікіх звяроў. А яны ж нікога не забілі, нічога не ўкралі, яны ні ў чым не вінаватыя. І кожную хвіліну іх жыццё можа абарвацца. Шчаслівы выпадак дапамог Джуліі і Івану ўцячы з канцлагера і незнарок сустрэцца. Яны былі разам тры дні, але за кароткі адрэзак часу перажылі і зразумелі многае. Самае галоўнае — каханне, якое Джулія пранясе праз усё жыццё і будзе ўдзячная лёсу і Богу за тыя тры жахлівыя і шчаслівыя дні. Менавіта толькі яна, бо Іван Цярэшка прынясе ў ахвяру сваё жыццё, каб выжыла Джулія. Яна выжыла і нарадзіла сына...

Кантраст, які прысутнічае ў спектаклі, — каханне і суровая вайна — прымушае гледача адчуць жорсткасць фашызму. Гэтая жорсткасць перадаецца не праз вобразы салдат з бутафорскай зброяй, не праз вычварныя дэкарацыі, а праз узаемаадносіны закаханых. Да герояў спектакля адчуваеш змяшаныя пачуцці: жаль і радасць. Радасць за тое, што яны ў такіх жорсткіх ўмовах не страцілі чалавечую годнасць, а жаль за тое, што на долю такіх добрых і маладых людзей выпала столькі нягод. Адразу хочацца пагадзіцца з галоўнай думкай спектакля: вайна нам не патрэбная, гэта вельмі страшна, калі чалавека забіваюць, і проста так, без аніякай на тое прычыны. І адразу выбіраеш для сябе каханне, пачуццё трапяткое і незабыўнае...

Не падобны да ўсіх іншых спектакляў на ваенную тэматыку ў сталічных тэатрах — праект рэжысёраў Б.Луцэнкі і У.Арлова "Выпадковы вальс". Чым адрозніваецца гэты спектакль **Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага,** нашым чытачам вядома. Аснову яго складаюць песні ваенных гадоў. Кожная музычная кампазіцыя — гэта асобная гісторыя, насычаная драматызмам, гэта хвалюючыя сцэны кахання, сустрэч і растанняў, гэта хвіліны чакання і веры ў шчаслівую будучыню без выбухаў і страт. Галоўны герой — ветэран (арт. Алег Корчыкаў), якому пашчасціла вярнуцца з вайны, але там, на шляху да перамогі, ён страціў сваіх блізкіх сяброў, а таму кожны дзень яго мірнага жыцця насычаны



ўспамінамі пра мінулае. І гэтыя ўспаміны паўстаюць перад гледачамі ў чатырнаццаці навелах, і ў кожнай — лёс тых, хто аддаў сваё жыццё ў імя свабоды... Насычаюць пастаноўку спевамі, танцамі, імправізацыйнай ігрой маладыя акцёры тэатра: А.Багданава, С.Чакерэс, А.Дуброўская, А. Шпакоўская, У. Глотаў і інш.

Беларускі дзяржаўны маладзёжны тэатр прадставіў на суд гледача работу рэжысёра М.Абрамава "Лейтэнант Валодзька" (паводле "Адпачынку з-за ранення" У.Кандрацьева). Дзеянне адбываецца ў Маскве ў маі 1942 года. Галоўны герой спектакля лейтэнант Валодзька (Ю. Баранаў) вяртаецца туды з-за свайго ранення. Але ён не разумее, што адбываецца ў яго родным горадзе: адкрытыя кінатэатры і рэстараны, футбольныя матчы на "Дынама", незразумелая весялосць навокал, а ён толькі што вярнуўся адтуль, дзе смерць і жах. Герой супрацьпастаўляецца грамадству. Але праходзіць дзень за днём, і малады лейтэнант разумее, што жыццё працягваецца, і разумее ён гэта дзякуючы каханню...

Як бачна, у кожным спектаклі вайна — і непераможнае каханне. Гэта зразумела, бо чалавек без кахання не можа жыць. Вось і яшчэ адзін спектакль — пра вайну ці пра каханне — у **Новым драматычным тэатры г.Мінска:** " Не бойся быць шчаслівым". Яго паставіў паводле п'есы А.Арбузава "Мой бедны Марат" рэжысёр Д. Нупрэйчык. Героі спектакля ў поўнай меры зразумелі, што такое кахаць і быць шчаслівым, як і тое, наколькі гэта цяжка — не мець магчымасці быць разам з каханым. Яны перажываюць, пакутуюць.

Умовы, у якіх апынуліся Марат, Ліка і Леанідзік, назваць жорсткімі — значыць, не назваць ніяк. Дзеянне пачынаецца зімой 1942-га ў блакадным Ленінградзе. У адной, пакінутай гаспадарамі, кватэры пасялілася маладая дзяўчына Ліка (А.Барчэўская). Тут яна знайшла месца, дзе можна на нейкі час схавацца ад бясконцых выбухаў і стрэлаў, дзе можна не бачыць загінуўшых людзей. Але аднойчы адносны спакой Лікі парушае прыход маладога чалавека, Марата (С.Лугоўскі), які з'яўляецца сапраўдным гаспадаром кватэры. Паміж маладымі людзьмі завязваюцца цёплыя адносіны, якія з цягам часу перарастаюць у каханне. Але тут у іх жыццё ўмешваецца Леанідзік (Ю.Шаланкоў), паранены салдат...

Усе героі спектакля шчыра вераць у ідэалы дабра і справядлівасці, мараць пра шчасце. Маладым людзям наканавана з годнасцю прайсці па суровых дарогах вайны і выжыць. А вось як склаўся іх лёс у мірны час, ці хапіла ў іх смеласці змагацца за сваё каханне і стаць па-сапраўднаму шчаслівымі?

"На вякі ў памяці" — кінаспектакль у адной дзеі **Мінскага тэатра-студыі кінаакцёра.** Тут найлепшым чынам злучаюцца кіно, музыка, проза і паэзія. Пастаноўшчыкі А. Бяспалы і У.Грыцэўскі паспрабавалі прасачыць за ваеннымі дзеяннямі ад пачатку да апошняга кроку вайны. Гэта гісторыя пра герояў, якія перамаглі і выратавалі свет ад нацызму.

У спектаклі гучаць мелодыі 30-ых гадоў, вершы П. Нязнамава, Н. Майорава, Р. Раждзественскага, урыўкі з аповесці С. Алексіевіч "У вайны не жаночы твар" і раман М. Шолахава, скарыстаныя таксама фрагменты з мастацкіх кінафільмаў: "Дзяржаўная мяжа", "Сыны ідуць у бой", "Альпійская балада" і інш.

Тэатры звяртаюцца да памяці людзей. І падзеі тых жудасных часоў не павінны забывацца. Нездарма ж існуе прымаўка: "Пакуль людзі памятаюць папярэднюю вайну, — новая не пачнецца"...

Таццяна ІЛЮКОВІЧ,
Ганна СЕЛЯДКОВА

Фота забяспечана аўтарамі

На здымку: сцэны са спектакля "Выпадковы вальс".

У Віцебску ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Якуба Коласа адбыліся чарговыя чытанні твораў нямецкамоўнай драматургіі, наладжаныя Інстытутам імя Гётэ (што ў Мінску).

Зазірнуць у твар ворагу?

Гэтым разам увазе гледачоў і дзеячаў тэатра былі прапанаваныя п'есы вядомага аўстрыйскага пісьменніка Джорджэ Табары. У чытаннях удзельнічалі чатыры творчыя калектывы краіны: Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Якуба Коласа (ён прапанаваў фактычна эскіз будучага спектакля "Гульні пры зменлівым святле" паводле п'есы "Майн кампф" пра маладыя гады Адольфа Гітлера), Мінскі абласны драматычны тэатр з Маладзечна (яго група — пры ўдзеле, дарэчы, народнай артысткі Беларусі Марыі Захарэвіч — прачытала п'есу "Дэманстрацыя"), студэнцкі тэатр БДУ культуры і мастацтваў (курс Валерыя Мазынскага, п'еса "Фантазіі паводле Гельберга") і Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы (п'еса "Матулін кураж").

Творы Джорджэ Табары складаныя, як сваёй канцэпцыяй, так і жанрава-стылёвай структурай. Ён ужывае біблейскія, міфалагічныя матывы, бярэ на ўзбраенне ідэі Дастаеўскага, К'еркегора, імкнецца да аналізу псіхалогіі як індывіда, так і масы, натоўпу. Прычым яго творы адрозніваецца пэўная стылёвая разнастайнасць: псіхааналіз тут мяжуе з сімволікай, гратэскам, адкрытай гульнёвай формай, парадаксальнасцю сітуацый (якія часам нагадваюць тэатр абсурду). Як і Дастаеўскі, сапраўдны гуманіст Табары спрабуе даследаваць, так скажам, генезіс зла. Яго найперш цікавіць, чаму менавіта ў XX стагоддзі нянавісць і жорсткасць гэтак ахапілі душы столькіх людзей, чаму мог нарадзіцца фашызм, чаму чалавецтва адрынула божыя, хрысціянскія запаветы. Для гэтага аўтар прапануе, кажучы фігуральна, зазірнуць у твар ворагу: такім чынам ён спадзяецца, што боскае ў чалавеку ўсё ж можа адолець д'ябальскае.

З чатырох творчых спроб дакрануцца да драматургіі Табары мяне найбольш уразіла работа купалаўцаў (не кажу тут пра віцяблян, усё ж такі яны паказалі амаль гатовы спектакль, чым паставілі сябе ў няроўнае становішча побач з іншымі). "Матулін кураж" — гэта п'еса-расповед на двух акцёраў. Тут няма ніякіх мадэрнісцкіх выбрыкаў. Усё надзвычай проста (і пабудова твора, і характары, і сітуацыя). Ды менавіта гэтай ашаламляльнай прастатой аўтар і ўздзейнічае на чытача (у дадзеным выпадку — гледача), выклікаючы ў яго катарсіс. А яшчэ ёсць у творы вымысел, які абвастрае трагічную праўду тых падзей і трагічную наканаванасць таго прываблівага вобраза, які тут і паказаны, выведзены з бязмежнай любоўю.

Увогуле, пра Халакост, гэтую жудасную старонку ў гісторыі чалавецтва, напісана нямала выдатных твораў.Чаго варты адзін толькі "Дзённік Ганны Франк". Побач з ім смела можна паставіць "Матулін кураж" Джорджэ Табары.

Твор аўтабіяграфічны. Сюжэт яго просты і жудасна-абсурдны адначасова: Маці, спадарыню Табары, у адзін цудоўны дзень хапаюць на вуліцы і вязуць на чыгунку, адкуль тысячы такіх жа яўрэяў адпраўляюць у Асвенцім на знішчэнне. Аўтар выразна паказвае, як фашызм мяняе простых аўстрыйцаў, тых жа матчыных суседзяў, якія з прыемных ветлівых грамадзян ператвараюцца ў жорсткае ваяўнічае быдла. Прытым што яўрэі, якіх гоняць на забой, нават у безвыходных варунках застаюцца людзьмі, захоўваюць чалавечую годнасць і пачуццё гумару — жыццесцвярджальнае пачуццё! І калі Маці павінна загінуць з такімі ж бязвіннымі ахвярамі, аўтар робіць свой "тэатральны ход": нямецкі афіцэр быццам адпускае яе. Мы цудоўна разумеем, што ў рэальнасці такога быць не магло: гэта ўсяго толькі ілюзія. Але аўтару хочацца верыць у лепшае ў чалавеку, спадзявацца, што ў спрадвечнай барацьбе дабра са злом першае ўсё ж пераможа.

У заключэнне адзначу выдатную работу артыстаў Тамары Міронавай (у ролі Маці) і Віктара Манаева (Аўтар). Ім удалося настолькі тонка і дакладна пранікнуць у сутнасць сваіх вобразаў, што, здаецца, згубілася мяжа між мастацтвам і жыццём.

Юрась ІВАНОЎСКІ,
тэатразнаўца
г.Віцебск

Час бенефісаў

Пачатак лета ў Нацыянальным акадэмічным тэатры оперы Беларусі прайшоў пад знакам бенефісаў. Ганаравалі легендарных салістаў, ветэранаў сцэны, усенародных любімцаў Віктара Чарнабаева, якому споўнілася 75, і Міхаіла Дружыну, які адзначыў 50-годдзе творчай дзейнасці.

Цяжка паверыць? Так, заслужаны артыст рэспублікі Міхаіл Дружына паўстагоддзя ўжо як саліст Беларускай оперы. Яшчэ цяжэй уявіць, што ён — адважны лётчык Ваенна-Узброеных сіл Савецкай Арміі! Ваяваў на Заходнім фронце, вызваляў ад фашыстаў Усходнюю Еўропу, узнагароджаны медалямі "За баявыя заслугі", "За Перамогу над Германіяй", двума польскімі ордэнамі "Срэбны Крыж Заслугі", медалём "За Перамогу і Свабоду", ордэнам "Чырвонай Зоркі". З часам да баявых узнагарод далучыліся юбілейныя медалі, ордэн "Знак пашаны", шматлікія ўрадавыя граматы.

Да спеваў Міхаіл Апанасавіч звярнуўся пасля вайны, калі быў ужо ў чыне капітана запасу ВПС Савецкага Саюза. У ягоным оперным рэпертуары больш як 40 партый, сярод іх і такія буйныя "шаляпінскія" ролі, як Млынар, Мефістофель, Пімен, Дасіфей, Хан Канчак ды інш. Асобная старонка творчасці — выступленні ў вайсковых часцях: сваім грамадзянскім абавязкам спявак лічыць падзяліцца перажытым праз музыку і праз асабістыя сустрэчы з маладымі вайскоўцамі. А падзяліцца ёсць чым. І перш за ўсё прыкладам чалавечай годнасці, адказнасці, сумленнасці ў адносінах да сваёй справы і да людзей.

У тэатры яму давяралі ўсё, што вымагала этычнай бездакорнасці: першыя паездкі за "жалезную заслону", вырашэнне канфліктаў у мясцкаме ці на таварыскім судзе. Ён жа не адмаўляў ні ў чым: пазачарговыя канцэрты, два спектаклі ў дзень, дзве ролі ў адным спектаклі... Такіх людзей, непадуладных "зоркавай" хваробе, сёння застаецца ўсё менш.

У дзень свайго бенефіса 2 чэрвеня Міхаіл Дружына выканаў у спектаклі "Хаваншчына" партыю манаха Дасіфея — кіраўніка абшчыны раскольнікаў. Гэтая роля сталася своеасаблівай адпаведнасцю характару М. Дружыны, выяўленнем сілы духу, шчырай веры, мужнасці, суровасці, прынцыповасці.

А 9 чэрвеня дзякуючы надзвычайнаму акцёрскаму таленту Віктара Чарнабаева расквеціўся жывым народным гумарам спектакль "Барыс Гадуноў". Адна з каронных роляў Віктара Максімавіча — вандроўны манах Варлаам, гаваркі, жулікаваты, п'янаваты рускі мужык. За камікаваннем вядомага жартаўніка Чарнабаева паўсталі рэдкасны досвед, удумлівасць, добразычлівая мудрасць глыбокага майстра ўвасаблення псіхалогіі характараў.

Віктар Чарнабаеў нарадзіўся ў Краснадары, спазнаў усе цяжкасці ваеннага дзяцінства і эвакуацыі. У музыку прыйшоў праз Ансамбль песні і танца Маскоўскай ваеннай акругі. Вучыўся ў Маскве, і хаця не можа пахваліцца закончанай адукацыяй, затое назапасіў каласальны вопыт вакальнай школы знакамітага Гуга Ціца. У Беларускую оперу трапіў раптоўна, затое адразу адчуў, што гэта ягоны сапраўдны "дом", у якім хочацца жыць і працаваць. Тым больш, калі побач былі такія паплечнікі: А. Саўчанка, З. Бабій, І. Сарокін, В. Глушакоў, А. Сухін, С. Данілюк, Н. Ткачэнка і шмат іншых найталенавітых асоб. Ужо ў 1964 годзе Чарнабаеў атрымаў званне народнага артыста Беларусі (і ўсесаюзнае прызнанне пасля гастроляў у Маскве).

Сёння за плячыма Віктара Чарнабаева каля 100 (!) роляў, тысячы паездак у "глыбінку" і за мяжу, агромністы фонд аўдыё- і відэазапісаў. Як тэатральныя легенды ўспамінаюцца ягоныя Дон Паскуале, Мендоза, Цар Дадон, Фальстаф. І што больш важна — геніяльна сыграныя драматычныя ролі, напоўненыя талентам пераўвасаблення: Млынар, Іван Сусанін, Філіп II, Кутузаў...

У яго ўлюбляюцца ўсе, хто прыходзіць у тэатр на "Барыса Гадунова", "Севільскага цырульніка", асабліва ж — на дзіцячыя спектаклі і Вечары рамансаў. Дзіва што: Віктар Максімавіч літаральна выпраменьвае радасць і аптымізм. Кожнае яго выступленне — гэткая ахвотная гутарка са слухачом, прывітанне, выяўленне любові да людзей і жыцця. Таму шмат гадоў Чарнабаеў увасабляе для слухачоў "твар і сімвал" Беларускай оперы, а для калег застаецца душой тэатра, яго гумарам, мужчынскай галантнасцю і дабрынёй.

Алена ЛІСАВА

Фота забяспечана аўтарам

На здымках: М. Дружына — Цар Дадон ("Залаты пеўнік") ; В. Чарнабаеў — Дон Паскуале ў аднайменнай оперы.

Альгердава спадчына

"Гадавалі і пралі матулі, З ніткай роднаю песня плыла..." У гэтых радках, некалі напісаных Ларысай Геніюш, — нібыта прыгаданы велічны дух, што спарадзіў народную творчасць, што стаў вечнай крыніцай натхнення і для віцебскай мастачкі Святланы БАРАНКОЎСКАЙ. Ужо неаднойчы яна прыемна ўражвала гледачоў сваімі работамі, выкананымі ў тэхніцы ручнога гладкага ткацтва. За плячыма сябра Беларускага саюза мастакоў і Беларускага саюза дызайнераў С. Баранкоўскай не адна персанальная выстава, дзе цэнтральнае месца заўжды займалі матывы Бацькаўшчыны. Ды і экспазіцыйныя пляцоўкі для сваіх выстаў яна заўжды выбірала адпаведныя: то гэта быў музей этнаграфіі ў Оршы, то галерэя Тызенгаўза ў Гродне. "Жывы голас" яе габеленаў, акрэсленых уплывамі нацыянальных традыцый, неаднойчы гучаў і на міжнародных выставах у Маскве, Даўгаўпілсе, Смаленску, Франкфурце-на-Одэры... І вось — чарговы паказ у Віцебску.



Невялічкая галерэя ў Віцебскім літаратурным музеі на гэты раз выглядае арганічным працягам пастаяннай экспазіцыі. Агульная канцэпцыя мастацкай выставы Святланы Баранкоўскай "Альгердава спадчына" арганічна спалучае выкананыя ў традыцыйна народным стылі габелены і суправаджальныя тэксты — са славутых і знаных беларускіх паэтаў Янкі Купалы, Яўгеніі Янішчыц, Наталлі Арсенневай, Ларысы Геніюш, Яўгеніі Мальчэўскай, Уладзіміра Скарынкіна, Алега Бембеля, Юркі Голуба і іншых. Таму і ўражанні ад кампазіцый С. Баранкоўскай нараджаюцца недзе на стыку мастацкіх асацыяцый і гучных паэтычных метафар беларускіх майстроў слова... Нібыта ўвасабляючы ў сімвалічных выяўленчых вобразах паэтычныя радкі: "З паганцаў я. Красе зямлі малюся..." (Л. Геніюш), Святлана Баранкоўская ў шэрагу сваіх кампазіцый звяртаецца да паганскіх матываў. Але з не меншым захапленнем увасабляе ў сваіх творах веліч і спакой хрысціянскіх святыняў ("Святадухаўская царква", "Царква Дабравешчання"), апелюючы ўжо да іншага аўтара — Ю. Голуба: "На руінах колішніх святынь Памяць нахіляецца да долу..."

У творах С. Баранкоўскай відавочны не столькі напружаны пошук першаэлементаў вобразнай мовы ці "экспансия семиотики", колькі зварот да нацыянальнай спадчыны мастацтва, прыродных, натуральных знакаў (як іх называў Э. Гомбрых), цікавасць да архаічных формаў мыслення і прымітыву. Пры гэтым спадчына мастацтва (background) зусім не ператвараецца ва ўзор, які проста варты капіравання. Абапіраючыся на яе, С. Баранкоўская нібыта спрабуе адлюстраваць свой уласны выток, ці "першааснову", якая, паводле ўяўленняў старажытных людзей, прадвызначае сутнасць і лёс кожнага чалавека.

Кампазіцыйна творы С. Баранкоўскай "нешматслоўныя". Вялікая колькасць габеленаў пабудаваная на дамінуючых гарызантальных або вертыкальных рытмах, на выкарыстанні простых выяўленчых элементаў (елачка, ромб, кола і г.д.), хвалістых ліній. Пакідаючы даволі значныя плоскасці не запоўненымі выяўленчымі элементамі, мастачка звяртае ўвагу на асаблівую тэкстуру асновы, натуральнасць яе "выяўленчага голасу", таму вельмі стрымана карыстаецца колерам, тактоўна ўводзіць яго ў магічную жывапісную палітру серабрыста-шэрых, карычнева-ўмбрыстых адценняў натуральнага палатна, ці радна.

Адвечныя каштоўнасці сілкуюць тэмы і вобразы габеленаў Святланы Баранкоўскай: "Берагіня", "Іўліянія і Альгерд", "Данатаркі", "Малітва"... Мінімалізм выяўленчых сродкаў вобразна акрэслівае сімвалічны характар нізкі тэкстыльных кампазіцый "Дванаццаць памераў шчасця". Даволі эфектна выглядаюць кампазіцыі "Птушка-1" і "Птушка-2", канцэптуальна падмацаваныя паэтычным тэкстам А. Бембеля: "Птушка белая над Краінай сіняй — То ахова наша і сіла... Гэта дух Святой Еўфрасінні... Гэта словы Святога Кірылы..."

Выстава С. Баранкоўскай у чарговы раз пераканала, што мы жывём у эпоху безумоўнага дамінавання вербальнай культуры, тэксту. Але тэкст, паэтычнае слова ў яе творах набывае цалкам самастойны вобразны сэнс і ўражвае майстэрствам пластычнай інтэрпрэтацыі.

Міхась ЦЫБУЛЬСКІ,
кандыдат мастацтвазнаўства

Фота забяспечана аўтарам

На здымках: кампазіцыі С. Баранкоўскай (воўна, лён, ручное ткацтва). 2004.



Кожная дзяржава, якая сябе паважае, будуе сістэму адукацыі, зыходзячы са сваіх нацыянальна-дзяржаўных інтарэсаў, а значыць, і ў адпаведнасці са сваёй нацыянальна-дзяржаўнай ідэалогіяй.

Рэфармаванне ці дэмантаж?

Амаль два дзесяцігоддзі нашу сярэднюю і вышэйшую школу трасе рэфарматарская ліхаманка. І гэты хваравіты стан, здаецца, набывае ўжо хранічную форму. Іншага і чакаць было нельга. Таму што, як сведчыць вопыт дваццаці гадоў, праводзімыя рэформы былі выкліканы не так аб'ектыўнымі прычынамі (гэта значыць рэальнымі патрэбамі адукацыйнага працэсу), як рэфарматарскім свербам у тых, хто гэтыя рэформы распачаў. Такі жорсткі дыягназ патрабуе, зразумела, разгорнутых доказаў. Што ж, затрымкі з імі не будзе.

Кожная форма чалавечай дзейнасці мае сваю ўнутраную логіку. Яна, гэтая дзейнасць, па-першае, павінна мець сваю асэнсаваную мэту, бо ў якасці дзейнасці самой па сабе – мэтай не можа быць. Фізіку мы вывучаем у школе зусім не для таго, каб ведаць, што жыў, маўляў, такі Ом, які выявіў, што сіла тока прама прапарцыянальная напружанню ў праваднiку, а хоць бы для таго, каб не торкнуць пальцам у разетку. Па-другое, павінны быць дакладна вызначаны сродкі, якія забяспечаць рэалізацыю пастаўленай мэты, бо калі гэтыя сродкі будуць неадэкватнымі, мэта не будзе дасягнутая.

Ці выкананы ў нашым выпадку гэтыя патрабаванні? Не. Прынамсі, нічога пераканаўчага на гэты конт грамадскасць ад нашых рэфарматараў пакуль што не пачула. Усе тлумачэнні звяліся, па сутнасці, да аднаго: Беларусь павінна прывесці сваю сістэму адукацыі ў адпаведнасць з «еўрапейскімі стандартамі», сфармуляванымі ў Балонскіх пагадненнях. У сувязі з гэтым узнікае некалькі пытанняў. Першае: з чыйго пальца і кім высмактаныя так званыя еўрапейскія стандарты? Наколькі мне вядома, амаль усе еўрапейскія краіны да гэтай пары мелі кожная сваю нацыянальную сістэму адукацыі. Пытанне другое: ці маюць намер Кембрыдж, Оксфард, Сарбона рэфармавацца ў адпаведнасці з Балонскімі пагадненнямі? Магу загадзя запэўніць, што яны гэтага не зробяць. Пытанне трэцяе: ці легітымныя тыя навацыі, што былі ўключаны ў апошнія гады ў навучальны працэс у адпаведнасці з Балонскімі пагадненнямі? Калі я не памыляюся, подпісу Беларусі пад гэтымі пагадненнямі няма. Ніякіх заканадаўчых актаў на гэты конт таксама не прынята — ні Нацыянальным сходам рэспублікі, ні Прэзідэнтам. Адкуль такая нецярплівасць? І наогул, ці магчыма аддаваць такое лёсавызначальнае пытанне, якім з'яўляецца праблема нацыянальнай адукацыі, на водкуп камусьці, хто б ён ні быў? Тым больш, што вырашаўся ён кялейна, у абыход педагагічнай супольнасці. У чыноўніцкіх кабінетах — міністэрскіх, універсітэцкіх.

Аднак усё гэта — фармальны бок справы. Ёсць і другі — сутнасны. Ці трэба спецыяльна даводзіць, што ўсякая рэформа толькі тады мае сэнс, калі скіравана на паляпшэнне справы. Чаму ж гэта элементарнае патрабаванне было праігнаравана ў дадзеным выпадку? Чаму пабуджальным матывам рэфармавання стала не паляпшэнне якасці адукацыі, а жаданне зрабіць так, «як у людзей»? Незалежна ад таго, што атрымаецца ў рэшце рэшт — выйгрыш ці пройгрыш. Калі б рэфарматары кіраваліся інтарэсамі справы, а не марным жаданнем не адставаць ад апошняй моды, яны павінны б былі паказаць, у чым заганнасць старой сістэмы адукацыі і што ў ёй належыць рэфармаваць. Яны таксама павінны былі б прывесці доказы таго, што прапанаваныя імі навацыі прывядуць да пазітыўных вынікаў, а не да пагаршэння справы. Нічога падобнага не было зроблена. Адзіны аргумент, які быў прыведзены, заключаецца ў тым, што старая сістэма адукацыі была ідэалагізаваная. Гэта — праўда. Але няхай назавуць хаця б адну краіну, дзе яна не была б ідэалагізаваная. Можа быць, ЗША? Няма такіх краін. Няма і быць не можа. Кожная дзяржава, якая сябе паважае, будуе сістэму адукацыі, зыходзячы са сваіх нацыянальна-дзяржаўных інтарэсаў, а значыць, і ў адпаведнасці са сваёй нацыянальна-дзяржаўнай ідэалогіяй. Але гэта — прадмет іншай размовы. А ў нашым выпадку дастаткова будзе нагадаць, што, нягледзячы на сваю ідэалагізаванасць, савецкая сістэма адукацыі была лепшай у свеце. І гэта прызнана ўсімі. У каго іншае меркаванне, няхай растлумачыць, чаму спецыялісты, што атрымалі падрыхтоўку ў савецкай школе, карыстаюцца такім попытам у замежжы. Чаму Захад «купляе» савецкіх вучоных і паасобку, і цэлымі навуковымі калектывамі?

У святле гэтых неабвержаных фактаў бачна, дарэчы, уся надуманасць таго аргумента, што, маўляў, калі мы не рэфармуем сваю школу, Захад не будзе прызнаваць беларускіх дыпломаў? Магу запэўніць, што пасля яе рэфармавання ў адпаведнасці з рэкамендуемымі «стандартамі», беларускія спецыялісты Захаду не будуць патрэбныя. Нават задарма. З той простай прычыны, што рынкавай гаспадарцы патрэбныя не стандартныя дыпломы, а нестандартныя думаючыя галовы. І наогул, недарэчнасць гэтай выдумкі добра выявіў... Прэзідэнт, калі растлумачыў рэфарматарам, што беларусы не збіраюцца рыхтаваць спецыялістаў для Захаду. Як кажуць, не ў брыво, а ў вока.

Адукацыйны працэс падначалены двум крытэрыям. Гэтыя крытэрыі — узровень адукацыі і якасць адукацыі. Першы фарміруе сістэму адукацыі, другі — нормы ацэнкі якасці ведаў. У адпаведнасці з першым крытэрыем сістэма адукацыі структурыруецца на пачатковую школу, сярэднюю школу, вышэйшую школу. У адпаведнасці з другім — нормы ацэнкі ведаў градзіруюцца на нездавальняючыя, здавальняючыя, добрыя і выдатныя. Не трэба мець вялікага цара ў галаве, каб зразумець: названыя крытэрыі не з неба звяліся, а прадыктаваныя самой логікай жыцця. Карысталіся імі і старая расійская школа, і савецкая сістэма адукацыі. Што ж нам прапануецца ўзамен? Прапануюць сістэму, пазбаўленую ўсялякай логікі. Хто можа растлумачыць, на аснове якога крытэрыю школа структурызавана на базавую сярэднюю школу, ліцэй, гімназію і каледж? У чым артэзіянская глыбіня падзелу вышэйшай адукацыі на бакалаўрыят і магістратуру? Хто такі бакалаўр — ні Богу свечка, ні чорту качарга. Нешта падобнае было некалі і ў СССР — настаўніцкія інстытуты. Яны былі народжаныя вялікім недахопам педагагічных кадраў. Як толькі гэты дэфіцыт быў ліквідаваны, настаўніцкія інстытуты таксама былі або ліквідаваны, або рэарганізаваны ў паўнавартасныя ВНУ.

Савецкая вышэйшая школа зберагала традыцыі класічнай адукацыі. Першыя два з паловай гады ішла агульнаадукацыйная падрыхтоўка студэнтаў. Наступныя два з паловай гады праводзілася паглыбленая спецыялізацыя. У выніку чалавек выходзіў з ВНУ, будучы высокаадукаваным спецыялістам, які спалучаў у сабе высокую агульную культуру з глыбокім веданнем сваёй спецыяльнасці. Маючы салідную агульнаадукацыйную падрыхтоўку, такі спецыяліст мог пры неабходнасці лёгка перакваліфікавацца. Ці варта казаць, як гэта важна сёння, ва ўмовах рынкавай эканомікі з яе кан'юнктурай рынку працы? Амерыканаканадская сістэма адукацыі, якую мы намагаемся капіраваць, з'яўляецца вузкапрагматычнай. Яна арыентавана на падрыхтоўку не прафесіяналаў, а свайго роду рабакопаў розных спецыяльнасцяў. Прасцей кажучы — маніпулятараў, што ў стане выконваць адну-адзіную аперацыю. Пра яе эфектыўнасць можна меркаваць хаця б па адукаванасці цяперашняга прэзідэнта ЗША, які блытае Славенію з Славакіяй, шукае Грэцыю на Скандынаўскім паўвостраве, і да гэтай пары ўпэўнены ў тым, што Венецыя — імя каханкі італьянскага прэм'ера Берлусконі.

У чым сэнс пераходу ад пяцібальнай сістэмы ацэнак да дзесяцібальнай? Бо хоць круць-верць, хоць верць-круць, а якасна веды можна адрозніць толькі як нездавальняючыя, здавальняючыя, добрыя і выдатныя. І не іначай. Зразумела, што ў рамках гэтых якасных адрозненняў яны маюць яшчэ колькасныя адрозненні. Але адрозненні гэтыя неістотныя, на іх можна не звяртаць увагі. І спецыялістаў мы будзем па-ранейшаму ацэньваць як дрэнных і добрых, пасрэдных і выдатных, а не як трохбальных і васьмібальных, пяцібальных і дзевяцібальных. Не, я не супраць дзесяцібальнай сістэмы. Можна ўвесці і стобальную, і тысячабальную. Я проста не разумею, навошта займацца падобнымі дрындушкамі. Няўжо іншых турбот няма?

Але што выклікае самы рашучы пратэст, дык гэта алілуйшчына, узнятая вакол тэсціравання. Я не выключаю, што ў нечым гэты метад можа быць карысным, а недзе і проста незаменным. Напрыклад, пры здачы экзаменаў на веданне правілаў дарожнага руху. Але бачыць у ім амаль што універсальны сродак праверкі ведаў — азначае ператварыць вучэбны працэс у нешта падобнае на тэлегульню «І ты хочаш зрабіцца мільянерам?» У прадметах, арыентаваных не на пасіўнае запамінанне, а на развіццё разумовых здольнасцяў, не на памяць, а на логіку, — яно наогул непрыдатнае, нават супрацьпаказанае. Цяпер тэсціраванне шырока выкарыстоўваецца на ўступных экзаменах. Аргументацыя такая: гэта, маўляў, дае ўсе роўныя шансы абітурыентам, ставіць іх у аднолькавыя ўмовы. Тое, што ўмовы павінны быць для ўсіх аднолькавыя — аксіома. Спрачацца з гэтым можа адно заўзяты хабарнік. Пытанне ў іншым: чаму крытэрыем паступлення ў ВНУ з'яўляецца не якасць ведаў, а «роўныя ўмовы»? Бо гэтыя «роўныя ўмовы» можна стварыць на ўзроўні ведання простай арыфметыкі. І яшчэ, ці ў роўных умовах будзе дзіцятка якога-небудзь банкіра, нашпігаванае рэпетытарам, і дачка ці сын земляроба? Хіба можа тэсціраванне замяніць жывое сумоўе з абітурыентам? Дазвольце таксама запытацца:



Усякая рэформа толькі тады мае сэнс, калі скіравана на паляпшэнне справы.

У пачатку артыкула я выказаў упэўненасць, што ні Кембрыдж, ні Оксфард, ні Сарбона не будуць перабудоўвацца, каб дагадзіць Балонскім пагадненням. Чым абгрунтавана гэта ўпэўненасць? Тым, што гэта элітныя навучальныя ўстановы, разлічаныя на «вяршкі грамадства». У такой сваёй якасці яны заклікаиы даваць паўнавартасную адукацыю. Ну, а быццу магчыма прапанаваць і «шырпатрэб», гэта значыць, «еўрапейскія стандарты». Але мае студэнты — не быдла. І свой беларускі лінгвістычны універсітэт я ацэньваю не ніжэй, чым англічане свой Кембрыдж і французы сваю Сарбону. Гатовы да любой праверкі. І калі выявіцца, што якасць падрыхтоўкі маіх студэнтаў ніжэй за якасць падрыхтоўкі слухачоў Кембрыджа і Сарбоны, я адразу падам заяву і пакіну педагагічную працу. Пайду падмятаць пад'езды і мыць лесвічныя сходы. Але пры адной умове: праверка будзе ўзаемнай...

Я не супраць рэфармавання нашай сістэмы адукацыі. Я супраць таго, каб пад калыханку пра рэформу ішло яе разбурэнне.

Валянцін АКУЛАЎ,
прафесар кафедры філасофіі МДЛУ,
доктар філасофскіх навук

Фота Віктара КАВАЛЁВА

Гісторыя абыходзілася з горадам Маладзечна жорстка і часам непрадказальна. Пра гэта сведчыць хаця б тое, што ў ім не захавалася знакавых архітэктурных помнікаў. Маладзечна ўзнікла і дагэтуль стаіць на скрыжаванні гандлёвых і ваенных шляхоў. Бясконцыя войны, пачынаючы з Сярэднявечча, выпальвалі, вынішчалі яго да падмурка. Пошасці знеслі незлічоную колькасць яго жыхароў. Але горад як легендарны Фенікс адраджаўся з попелу і даў нашай радзіме славутыя імёны беларускіх сыноў, якія сваёй — хто гераічнай, хто навуковай, хто асветніцкай дзейнасцю пакінулі багатую культурна-гістарычную спадчыну.

Маладзечна — гэта не толькі фестываль

У свядомасці сённяшніх беларусаў Маладзечна найперш звязана з фестывалямі: беларускай песні і паэзіі, з тэатральнай "Маладзечанскай сакавіцай". Але культурную неардынарнасць горада вызначыла не толькі сучаснасць, а і мінулае, імёны, якія належаць вечнасці. Сёлета Маладзечна, дзе пад 100 тысяч жыхароў, спаўняецца 617 гадоў.

Археолагі сцвярджаюць, што яшчэ ў эпоху неаліта: II—IV тысячагоддзе да н.э., на тэрыторыі сённяшняй Маладзечаншчыны жылі плямёны культуры шнуравой керамікі (усходніх балтаў), асноўным заняткам якіх былі жывёлагадоўля і земляробства. Ішоў час, і ў VI—IX стагоддзях н.э. гэтая зямля становіцца ўскраінай Полацкага княства, заселенай плямёнамі крывічоў. З XIII стагоддзя адна за адной навакольныя тэрыторыі падпадаюць пад уплыў Вялікага княства Літоўскага. Нарэшце настае момант першай пісьмовай згадкі пра горад Маладзечна, а дакладней у прысяжным лісце Дзмітрыя Альгердавіча Корыбута, князя Ноўгарад-Северскага княства, які 16 снежня 1388 года быў накіраваны ў Вільню.

Як усе беларускія гарады, Маладзечна ўзвялі на беразе рэчкі — Маладачанкі, што ўпадала ў больш паўнаводную Ушу. З часам яна абмялела, і як Няміга ў Мінску, працягвае сваё жыццё ў калектары пад старой часткай паселішча. Назву яно, верагодна, атрымала ад былой ракі. Праўда, назву не раз спрабавалі выводзіць ад слоў "маладзец", "малады", "малодшы". Аднак усё гэта толькі здагадкі. Сам жа горад узнік у вельмі зручным месцы: на скрыжаванні сухапутных дарог на Мінск, Вільню, Гарадок, Крэва, Лагойск, Ліду, Валожын, Нарач. Зразумела, тут часта затрымліваліся купцы, вялі гандлёвыя справы, што паўплывала на далейшае развіццё горада і яго эканомікі.

Адзін з першых уладальнікаў Андрэй Заслаўскі зрабіў Маладзечна вялікакняжацкім сталовым маёнткам і пабудаваў на сухім беразе балоцістай Ушы замак. Ён і стаў у далейшым духоўным цэнтрам, які даў магутны патэнцыял для развіцця культуры гэтаму слаўнаму мейсцу. У наступныя гады гаспадарамі замка былі Мсціслаўскія, Сангушкі, Радзівілы, Агінскія, Тышкевічы, Лапацінскія, Рачкоўскія і інш. І хаця за сваю гісторыю Маладзечна так і не займела магдэбургскага права, якім карысталіся Мінск, Слуцк, Брэст, Гродна, Магілёў і нават суседнія Радашковічы, яно ў 1740 годзе атрымала ад караля і вялікага князя Жыгімонта III Аўгуста прывілей на правядзенне штотыднёва двух рынкаў: у нядзелю і пятніцу, а таксама двух кірмашоў: вясновага і восеньскага. У 1757 годзе нададзены новы прывілей — на штогадовыя чатырохтыднёвыя кірмашы. У выніку Маладзечна становіцца гандлёва-рамесніцкім горадам, дзе рамеснікі займаюць прыкметнае становішча. Зрэшты, прывілеі замянялі некаторыя нормы магдэбургскага права, згодна з якімі тутэйшыя мяшчане карысталіся мажлівасцю самакіравання.

У другой палове XVIII ст. горад у выніку шмат якіх аб'ектыўных законаў развіцця стаў губляць свае перавагі і ператварыўся ў заштатнае мястэчка. Падчас войнаў Расіі з Рэччу Паспалітай і Паўночнай вайны Пятра I з Карлам XII, калі войскі апошняга захапілі горад, насельніцтва панесла значныя страты. Пасля 1793 года Маладзечна ўвайшло ў склад Расійскай імперыі як мястэчка Вілейскага павета Мінскай губерніі. Продкі сённяшніх гараджан супрацоўніцтвалі гэтым ганебным для сябе падзеям і бралі ўдзел ва ўсіх трох нацыянальна-вызваленчых рухах.

Увосень 1812 года тут адбылася сусветнавядомая падзея. Пры адступленні з Расіі Напалеон спыніўся ў палацы старога Францішка Агінскага, знакаміты род якіх ператварыў старажытны замак у сваю рэзідэнцыю ў 70—90 гады XVIII ст. У адным з яго пакояў Напалеон Банапарт прадыктаваў сакратару свой апошні 29-ы бюлетэнь, у якім складаў з сябе паўнамоцтвы галоўнакамандуючага. Імператар больш за ўсё вінаваціў за свае няўдачы мароз, зіму і бездарожжа. Нашэсце французскага войска прынесла гораду нямала бед і стратаў, насельніцтва зменшылася ўдвая.

Аднак жыццё пачало патроху адраджацца. Узнавіла працу мясцовае шляхецкае павятовае вучылішча, якое яшчэ ў 1811 годзе намаганнямі вядомага ў свой час літаратара і мастака Францішка Агінскага было пераведзена з Бабруйска ў Маладзечна. Так у гэтых мясцінах з'явілася першая вучэбная ўстанова, якой славуты магнат неўзабаве прапанаваў частку свайго палаца і бібліятэку. Некаторы час вучні жылі ў былым замку, а потым перабраліся ў кляштар трынітараў, які ў 1758 годзе заснаваў вядомы дзяржаўны дзеяч князь Міхал Казімір Агінскі. У вучылішчы выкладалі прафесары з Варшавы і Пецярбурга, навучалі польскай, лацінскай, французскай і нямецкай мовам, гісторыі, геаграфіі, логіцы і праву, фізіка-матэматычным і прыродазнаўчым навукам. Гэта адукацыйная ўстанова дала свету шмат славутых імёнаў і талентаў, адно з якіх — паэт-рамантык, сябар Адама Міцкевіча — Тамаш Зан.

Пасля паўстання 1830—1831 гадоў, закрыцця кляштара трынітараў, скасавання дзеяння Літоўскага Статута і ўвядзення расійскага заканадаўства, у 1864 годзе на месцы былога шляхецкага вучылішча адчыняецца першая на тэрыторыі Расійскай імперыі настаўніцкая семінарыя. Нягледзячы на палітыку русіфікацыі царскіх уладаў, установа стала alma mater для цэлай кагорты дзеячаў беларускага грамадска-культурнага руху, сярод якіх Міхась Чарот — паэт і кіраўнік першага ў краіне літаб'яднання "Маладняк", выдатны выканаўца славянскіх песень і оперны спявак Міхась Забэйда-Суміцкі і інш. У семінарыі рэпеціраваў хор, які лічыўся лепшым у Беларусі, ім кіраваў магістр духоўнай акадэміі Ю.Ф.Крачкоўскі, у далейшым — вядомы этнограф і фалькларыст.

Так паступова фарміравалася ўласцівая толькі гэтаму гораду культурная аура. І не апошнюю ролю тут адыграла унікальнае знаходжанне Маладзечна паміж дзвюх сталіц: 75 км да Мінска і 125 — да Вільні. У 1872 годзе праз паселішча прайшла Любава-Роменская чыгунка, а ў 1960-ыя гады стала хадзіць і першая ў нашай краіне электрычка. Цяпер горад Маладзечна не назавеш правінцыяй, ён з'яўляецца спадарожнікам сталіцы, бярэ на сябе пэўным чынам яе культурную перанасычанасць. Сёння культурную палітыку горада фарміруюць 26 адпаведных устаноў, сярод якіх і абласны драматычны тэатр, тэатр лялек "Батлейка", музычнае вучылішчы імя М.К. Агінскага, дзіцячыя музычная і мастацкая школы, школа духавых інструментаў, Палац культуры, цэнтральная бібліятэка імя Максіма Багдановіча і іншыя. Нельга асобна не назваць і абласны краязнаўчы музей, дырэктарам якога доўгі час быў доктар гістарычных навук, лаўрэат прэміі імя Ф.Скарыны Генадзь Каханоўскі. Ён рупліва і нястомна даследаваў гісторыю, культуру роднага краю.

І ўсё ж такі, калі казаць пра культурную адметнасць горада, то на першым месцы бясспрэчна стаіць знакаміты род Агінскіх. Найбольш праславіўся Міхал Клеафас Агінскі — пляменнік князя Францішка Агінскага. Слынны дыпламат і кампазітар доўгі час жыў і ствараў свае шэдэўры ў маёнтку Залессе. Дзякуючы таленавітаму музыку, Залессе на пачатку XX стагоддзя зрабілася сапраўдным культурным цэнтрам, куды з'язджаўся ўвесь свет беларускай, польскай і рускай культуры. У 1814 годзе, пасля смерці старога князя, маладзечанскі палац пераходзіць ва ўласнасць да яго пляменніка, які на прыкладзе свайго знакамітага дзядзькі перадае вучылішчу ўжо палову радавога маёнтка, а разам і рэшткі бібліятэкі, і значную колькасць музычных інструментаў. Але лёс М. К. Агінскага, як палітыка, складаецца трагічна. Расійскі імператар так і не падпісаў яго праект канстытуцыі, што дала б самастойнасць радзіме кампазітара, і Агінскі з'язджае ў Фларэнцыю, дзе ў 1833 годзе памірае.

Удзячныя нашчадкі не забылі свайго слыннага земляка. У гонар Міхала Клеафаса Агінскага названа адна з вуліц Маладзечна, а на музычным вучылішчы, якое таксама носіць яго імя, вісіць мемарыяльная дошка, дакладна такая, што і на доме ў Італіі, дзе пражыў свае апошнія дні аўтар славутага паланеза "Развітанне з Радзімай". Плошчу перад вучылішчам упрыгожвае помнік вялікаму земляку, зроблены скульптарам Валяр'янам Янушкевічам. Такі шыкоўны па сваім эстэтычным выкананні помнік, на думку шмат якіх абазнаных людзей, змог бы ўпрыгожыць не адну сталіцу свету.

Ірына КЛІМКОВІЧ

На здымках: помнік М.Агінскаму; Маладзечанская настаўніцкая семінарыя, канец XIX — пачатак XX ст.

Фота забяспечана аўтарам

Пад кожны настрой — сваё захапленне

Алена БОРМАТАВА — вядучая навін на тэлеканале "Лад", першая вядучая інфармацыйнай праграмы "Навіны — Мінск" на Першым нацыянальным тэлеканале. Нарадзілася ў 1978 годзе ў Мінску. У 2002-м скончыла факультэт журналістыкі Белдзяржуніверсітэта. На тэлебачанні з 1999 года. У эфіры — з 2002-га. Жыццёвы дэвіз: "Усё, што не робіцца — да лепшага!"

— Лена, ты адна з тых вядучых, хто адкрываў інфармацыйнае вяшчанне на тэлеканале "Лад". Цяжка было?

— Калі пачыналіся навіны на тэлеканале "Лад", я праходзіла стажыроўку ў Маскве і непасрэднага ўдзелу ў падрыхтоўцы першых выпускаў не прымала, але думкамі была ў Мінску. А цяжкасці... Без іх аніяк, асабліва, калі стаіш на старце. Праўда, і цяжкасцямі пачатак інфармацыйнага вяшчання на "Ладзе" не назвала б. Гэта было знаходжанне агульнай мовы з новымі брыгадамі рэжысёраў, тэхнікаў, аператараў, з новымі карэспандэнтамі. Навіны — зладжаны механізм, і ўсе павінны размаўляць на адной "інфармацыйнай мове", хутка і правільна знаходзіць выйсце з нечаканых сітуацый. І гэта адзін з крытэрыяў нашай працы. Зараз успамінаю перыяд знаходжання агульнай мовы і разумею, што той час быў самым цікавым, бо пачатак — заўсёды яркі, запамінальны і непаўторны.

— Вернемся да тваёй стажыроўкі ў Маскве. Што гэта былі за заняткі, хто выкладаў і які след пакінулі ў тваёй прафесіі?

— Так, я прайшла стажыроўку ў Расійскім інстытуце перападрыхтоўкі кадраў радыё і тэлебачання. Вучоба ў такіх мэтраў, як Уладзімір Познер, Савік Шустар, Сяргей Вазіянаў, а таксама ў пачынальніка савецкай інфармацыйнай школы Леаніда Дзмітрыева шмат мне дало. Па-новаму паглядзела на сваю тэлевізійную працу. Мне прыемна, што маскоўскія выкладчыкі гаварылі толькі добрае пра ўзровень інфармацыйнага вяшчання АТН.

— Вядучая навін — творчая прафесія, ці ты атаясамліваеш яе з нечым іншым?

— Ведаеш, у міжнароднай журналістыцы ёсць чатыры якасці ідэальнага вядучага. Гэта голас і манера гаварыць, журналісцкі прафесіяналізм, асабістая прывабнасць. І, вядома ж, без творчасці не абысціся, нават у такім афіцыйным жанры, як інфармацыя. Шмат хто з выкладчыкаў лічыць, што ў навінах недапушчальныя эмоцыі, павінна быць толькі канстатацыя факта. Я з гэтым не згодная. Лічу, што і ў навінах эмоцыі маюць права на жыццё. У эмоцыях вядучага і ёсць частка творчасці. Навіны — яны ж розныя, як мы з вамі. А вось з тым, што "ў кадры" нельга паказваць свае адносіны да таго, што адбываецца навокал, згодная.

— Так, інфармацыйны вядучы не павінен паказваць гледачу сваю пазіцыю. Але вядучы — звычайны чалавек са сваімі прыхільнасцямі. Што для цябе найбольш прыемна даносіць да гледача?

— Люблю паведамляць пра дасягненні, перамогі нашых спартсменаў, грандыёзныя культурныя падзеі і праекты ў Беларусі. Прытрымліваюся той пазіцыі, што мне цікава ўсё, бо калі інфармацыя не падабаецца вядучаму, то яна не будзе падабацца і гледачу.

— Ці не перашкаджае інфармацыйны рытм паўнацэнна жыць?

— Навіны — гэта рытм жыцця, і мае блізкія таксама яго прытрымліваюцца. Нельга сказаць, што праца мне перашкаджае. Так, я шмат што не паспяваю, не заўсёды трапляю на спектаклі, якія хочацца паглядзець, не заўсёды магу прыехаць у госці да родных... Але ж гэта маё жыццё. І я проста ўлюбёна ў сваю, шалёнага рытму, працу.

— Твая праца на тэлебачанні — гэта поспех, ці ёсць іншая мара? Дарэчы, як увогуле дасягнуць поспеху?

— Дакладнай формулы, думаю, не ведае ніхто. Але ўсе ведаюць, што для яго дасягнення патрэбна працаваць шмат і добрасумленна. Так, стаць вядучай навін — таксама поспех. Але сёння хачу шчыра сказаць, што сваёй працай не заўсёды задаволена. І гэта стымул для прафесійнага росту. Пра яго і мару. Пераканана, што магу лепш, і значыць, зраблю лепш.

— Якому віду мастацтва ты аддаеш перавагу?

— Люблю ўсю культуру: і беларускую, і замежную. Але ёсць і свая пазіцыя. Напрыклад, мне бліжэй літаратура, чым харэаграфія, люблю больш тэатр, чым цырк. Калі выбіраць паміж фотаздымкамі і выяўленчым мастацтвам, то выберу апошняе. Але ж гэта не гаворыць пра тое, што не хаджу ў цырк, на канцэрты танцавальных калектываў, што мне не падабаюцца фотамастакі. Усяму сваё месца, і пад кожны настрой прачынаецца сваё захапленне. У літаратуры я чалавек шматпалярны. Чытаю заўсёды і шмат. Не люблю толькі фантастыку і фэнтэзі. З задавальненнем чытаю Шамякіна, Шолахава і Рэмарка. Захапленне апошнім, дарэчы, перадалося і брату. Магу і жаночыя часопісы пагартаць. З імі адпачываю. Перыядычна звяртаюся да класікаў.

— А якія чалавечыя якасці ты ніколі не прымеш, не даруеш?

— Прытрымліваюся выказвання: "Ніколі не кажы "ніколі", бо з часам усё можа змяніцца. На сёння я не выношу крывадушнікаў і зайздроснікаў. Не люблю, калі мяне падманваюць, асабліва людзі, якім верыш.

— У цябе ёсць самае любімае свята? Як яго сустракаеш?

— Дзень нараджэння мамы. Заўсёды імкнуся павіншаваць яе першай, купляю ёй любімыя белыя хрызантэмы і вечарам у цесным коле сям'і і сяброў мы адзначаем гэтую падзею. Дарэчы, кожны год маму і прырода віншуе: у дзень нараджэння за вокнамі зіхаціць сонца — стаіць чароўнае бабіна лета.

Зміцер АРЦЮХ
Фота забяспечана аўтарам

Больш узаемадзеяння дзеля інфарміравання

Меры па ўдасканаленні прапагандысцкай і інфармацыйнай работы ў забруджаных радыёнуклідамі раёнах Гомельскай вобласці былі разгледжаны на выязным пасяджэнні калегіі Камітэта па праблемах наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, якое адбылося ў Інстытуце радыялогіі Камчанобыля ў горадзе Гомелі.

У галіне інфарміравання Камчарнобылю за апошнія два гады ўдалося здзейсніць пераход ад разрозненых, малаэфектыўных мерапрыемстваў да шырокай, сістэматычнай работы дзякуючы рэалізацыі распрацаванай у 2003 годзе Канцэпцыі інфарміравання па чарнобыльскіх праблемах. Яна накіравана на павышэнне эфектыўнасці мерапрыемстваў па пераадоленні наступстваў чарнобыльскай катастрофы шляхам стварэння сістэмы інфарміравання, заснаванай на скаардынаваным узаемадзеянні органаў дзяржаўнага кіравання, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, СМІ, актыўнага далучэння насельніцтва пацярпелых рэгіёнаў у рашэнні паслячарнобыльскіх праблем.

У рэалізацыі мерапрыемстваў па ажыццяўленні інфармацыйнай работы з насельніцтвам пры каардынацыі Камчарнобыля ўдзельнічаюць Рэспубліканскі цэнтр радыяцыйнага кантролю і маніторынгу Мінпрыроды, Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека Міністэрства аховы здароўя, Мінсельгасправ, Мінжылкамунгас, "Беллесрад" Мінлясгаса, Мінадукацыі, Мінсацпрацы і Нацыянальная акадэмія навук Беларусі.

Формы і метады інфармацыйна-прапагандысцкай работы Камчарнобыля разнастайныя: узаемадзеянне са СМІ — рэспубліканскімі і рэгіянальнымі, асваенне інфармацыйнай прасторы Інтэрнет, падрыхтоўка і выданне інфармацыйных бюлетэней, памятак для насельніцтва, даведачна-інфармацыйных матэрыялаў па праблемах чарнобыльскай катастрофы, сацыяльна-радыяцыйных пашпартоў, рэкамендацый па пытаннях сельскагаспадарчай вытворчасці на забруджаных радыёнуклідамі тэрыторыях і правядзенне рэспубліканскіх інфармацыйна-метадычных семінараў. Інстытутам радыялогіі толькі ў 2004 — 2005 гадах выдадзена 139 папулярных выданняў практычна па ўсіх накірунках чарнобыльскай праблематыкі агульным тыражом каля семнаццаці тысяч экземпляраў.

Адным з асноўных этапаў у далейшым развіцці адзінай сістэмы інфарміравання ў Гомельскай вобласці можна лічыць стварэнне пастаянна дзеючых экспазіцый "Пераадоленне наступстваў чарнобыльскай катастрофы" ў Добрушскім, Брагінскім, Веткаўскім, а таксама Кармянскім, Чачэрскім, Нараўлянскім і Хойніцкім раёнах. У той жа час, інфармацыя, якая паступае, даступна ў шэрагу выпадкаў толькі для сярэдняга кіруючага звяна работнікаў гэтых раёнаў. Даступнасць жа яе для шырокіх слаёў насельніцтва пакідае жадаць лепшага. Галоўная прычына гэтага — недакладнасць сістэмы ўзаемадзеяння Камчарнобыля з мясцовымі органамі ўлады і кіравання ў ажыццяўленні інфармацыйна-прапагандысцкіх задач, арганізацыі работы з насельніцтвам. Да сённяшняга дня цалкам не даследаваны патрабаванні насельніцтва ў інфармацыі, не адпрацаваны спосабы яе давядзення да кожнага жыхара пацярпелых рэгіёнаў. У інфармацыйным сеціве практычна не задзейнічаны сельскія саветы, як галоўнае апорнае звяно ў рабоце з насельніцтвам.

Гэтыя і іншыя значныя недахопы былі дэталёва прааналізіраваны на выязным пасяджэнні калегіі Камчарнобыля, што дазволіць наладзіць схему ўзаемадзеяння розных органаў кіравання, якія выконваюць задачы інфарміравання пацярпелага ад наступстваў чарнобыльскай аварыі насельніцтва. Гэта схема будзе ўяўляць сабой дадатковую частку да існуючай Канцэпцыі інфарміравання, і яе рэалізацыя павысіць значнасць атрымліваемых вынікаў.

В.К.

ЗАХАРАВА, 19

Пішыце на адрас: 220005, Мінск, вул. Захарава, 19, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва"; e-mail: minsk@lim.by
Адрас у Інтэрнеце — www.lim.by

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Літаратура і Мастацтва» прымае да разгляду:
выдавецкія праекты самай шырокай тэматыкі;
выканае ўвесь спектр рэдакцыйна-выдавецкіх паслуг;
арганізуе рэкламу і прэзентацыю выданняў.
Вул. Захарава, 19, тэл.: 284-79-65.

Ліцэнзія на выдавецкую дзейнасць № 02330/0056810 ад 2 сакавіка 2004 года, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Кнігі можна набыць у Рэдакцыйна-выдавецкай установе "Літаратура і Мастацтва". Тэлефоны аддзела маркетынгу і рэкламнай дзейнасці: 284-79-65; (факс) 284-82-04.



складваецца так, што за квіткамі на пэўны фільм выстройваюцца чэргі, мы прадэманструем яго адразу ў шасці залах. А калі попыт гледачоў на стужку невялікі, ён можа дэманстравацца і ў адной зале.

На пытанне, ці распаўсюдзіцца на мінскі мультыплекс замежная практыка продажу папкорну перад кінасеансамі, Васіль Коктыш адказаў:

— Наўрад ці мы пойдзем на тое, каб прадаваць у нашых кінатэатрах папкорн. Шмат каго з гледачоў гэта раздражняе. Дарэчы, насуперак распаўсюджанаму меркаванню, у некаторых штатах ЗША папкорн у кінатэатрах забаронены. З замежнага вопыту мы будзем браць лепшае — найноўшыя тэхналогіі будаўніцтва мультыплексу.

Па словах Васіля Коктыша, кожная дэталь прадвызначана для камфорту гледачоў. У тым ліку і наяўнасць у новым кінатэатры пакоя для дзяцей. Бо зараз многія маладыя не маюць магчымасці пакінуць іх дома. А дзецям да 5 год увогуле не рэкамендуецца глядзець кінафільмы: яны могуць аказаць негатыўны эмацыянальны ўплыў.

Глядач прагаласуе кашальком

Кошт білета ў мінскі мультыплекс — галоўны чыннік ягонага поспеху, лічаць эксперты



Даведка «ЛіМа»

Мультыплексны кінатэатр — некалькі невялікіх кіназалаў, што аб'яднаны пад адным дахам. Гэтая тэхналогія зараз карыстаецца вялікім попытам ва ўсім свеце. У суседняй Расіі актыўна ствараюцца цэлыя сеткі мультыплексных кінатэатраў, якія адыгрываюць значную ролю ў павышэнні касавых збораў міравых блокбастэраў.

У "Беларусі" ж фільмы не паказвалі з 1997-га. Некалькі год таму ў памяшканні кінатэатра планавалі размясціць Музей сучаснага мастацтва. Над двухпавярховым кінатэатрам тады задумалі надбудаваць яшчэ адзін паверх, а на прылягаючай тэрыторыі размясціць парк скульптур. Аднак праект не прайшоў узгаднення ў сувязі з крытычным станам будынка.

Планы будаўніцтва ў Мінску на месцы былога кінатэатра "Беларусь" шматзальнага кінакомплексу паступова ператвараюцца ў жыццё. Нагадаем, што эскізнае рашэнне гэтага праекта было ўхвалена на пасяджэнні архітэктурнага савета камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінгарвыканкама яшчэ 28 студзеня, і хутка пачнецца ўзвядзенне першага мінскага мультыплексу. Заказчыкам выступіла унітарнае прадпрыемства "Кінавідэапракат", а распрацоўшчыкам праекта — інстытут "Белпраект".

Прадстаўляючы эскіз, адзін з ягоных аўтараў, архітэктар Валерый Куцко паведаміў, што будынак кінатэатра "Беларусь" знаходзіцца ў вельмі дрэнным стане і хутка будзе знесены. На яго месцы з'явіцца шасцізальны мультыплекс, разлічаны на 1,5 тысячы наведвальнікаў (у кожнай зале зможа размясціцца каля 250 чалавек). Вышыня новага кінакомплексу, паводле праекта, роўная 12 метрам, а вобразнае рашэнне будынка архітэктары характарызуюць як "хайтэк".

На першым паверсе комплексу плануецца размясціць кафэ, дзіцячы бар і пакой для дзяцей, некалькі крам, ігравы цэнтр, а таксама памяшканне для адміністрацыі кінатэатра. Каб вырашыць праблему з паркоўкай аўтамабіляў, ля комплексу будзе пабудавана падземная двухузроўневая аўтастаянка на 200 машын з заездам з боку вуліцы Раманаўская Слабада і выездам на вуліцу Ракаўская.

Кошт праекта складзе каля 11 мільярдаў рублёў. Па падліках спецыялістаў, ён поўнасцю акупіцца прыкладна праз пяць год.

Як распавёў генеральны дырэктар "Кінавідэапракату" Васіль Коктыш, у адпаведнасці з працэдурай праекта першага на Беларусі мультыплексу трэба прайсці яшчэ колькі ўзгадненняў. Будаўніцтва будзе доўжыцца паўтара года.

— Мінску неабходны шматзальны кінатэатр. І вельмі важна, каб ён размяшчаўся ў цэнтры сталіцы. Бо, як бы мы ні добраўпарадкоўвалі кінатэатры ў мікрараёнах, праз увесь горад людзі ў іх ездзіць не будуць, — лічыць Васіль Коктыш. — У шматзальным комплексе ёсць магчымасць накіроўваць плыню гледачоў. Калі сітуацыя

У апошнія гады наведваемасць мінскіх кінатэатраў рэзка ўзрасла, таму неабходнасць будаўніцтва ў сталіцы сучаснага кінакомплексу сапраўды наспела. Але наколькі паспяховым будзе праект?

Кінакрытык Антон Сідарэнка лічыць, што гэта шмат у чым залежыць ад кошту квітка:

— Мне падаецца, што прыняты сёння кошт квітка сеанса — у мінскіх кінатэатрах (4-6 тыс. рублёў — **аўт.**) аптымальны. Калі ў мультыплексе квіток атрымаецца даражэйшым, прывабіць туды гледача будзе складана.

Канечне, шмат што залежыць і ад падбору фільмаў у мультыплексе. На думку Антона Сідарэнкі, аснову рэпертуару складуць касавыя галівудскія кінастужкі, а прыхільнікі "кіно не для ўсіх" будуць па-ранейшаму збірацца на паказах у кінатэатрах "Перамога" і "Цэнтральны".

Мікола МІРОНЧЫК

Фота аўтара

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА II ПАЎГОДДЗЕ 2005 ГОДА!

«Літаратура і мастацтва»
Індывідуальная (індэкс — 63856)
на 1 месяц — 3500 руб.
на 3 месяцы — 10500 руб.
Ведамасная (індэкс — 638562)
на 1 месяц — 4800 руб.
на 3 месяцы — 14400 руб.
Льготная (індэкс — 63880)
на 1 месяц — 3800 руб.
на 6 месяцаў — 22800 руб.

"Маладосць"
Індывідуальная (індэкс — 74957)
на 1 месяц — 3600 руб.
на 3 месяцы — 10800 руб.
Ведамасная (індэкс — 749572)
на 1 месяц — 4800 руб.
на 3 месяцы — 14400 руб.
Льготная (індэкс — 00731)
на 1 месяц — 3700 руб.
на 6 месяцаў — 22200 руб.

"Полымя"
Індывідуальная (індэкс — 74985)
на 1 месяц — 3500 руб.
на 3 месяцы — 10500 руб.
Ведамасная (індэкс — 749852)
на 1 месяц — 4500 руб.
на 3 месяцы — 13500 руб.
Льготная (індэкс — 00727)
на 1 месяц — 3700 руб.
на 6 месяцаў — 22200 руб.

"Всемирная литература"
Індывідуальная (індэкс — 74863)
на 2 месяцы — 3800 руб.
на 4 месяцы — 7600 руб.
Ведамасная (індэкс — 748632)
на 2 месяцы — 4800 руб.
на 4 месяцы — 9600 руб.
Льготная (індэкс — 00729)
на 2 месяцы — 4000 руб.
на 6 месяцаў — 12000 руб.

"Нёман"
Індывідуальная (індэкс — 74968)
на 1 месяц — 3500 руб.
на 3 месяцы — 10500 руб.
Ведамасная (індэкс —749682)
на 1 месяц — 4500 руб.
на 3 месяцы — 13500 руб.
Льготная (індэкс — 00728)
на 1 месяц — 3700 руб.
на 6 месяцаў — 22200 руб.

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе ўзнагароджаны ордэнам Дружбы народаў

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная рада:
Святлана БЕРАСЦЕНЬ
Уладзімір ДАВЫДОЎСКІ (в. а. намесніка галоўнага рэдактара)
Віктар КАВАЛЁЎ
Янка ЛАЙКОЎ
Інеса ПЕТРУСЕВІЧ
Ірына ШАЎЛЯКОВА
Наталля ЯКАВЕНКА

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220005, Мінск, вул. Захарава, 19

ТЭЛЕФОНЫ:
галоўны рэдактар — 284-66-73
намеснік галоўнага рэдактара — 284-66-73

АДДЗЕЛЫ:
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-81-53
паэзіі, літаратурнага жыцця, крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы — 284-66-73
музыкі, тэатра, кіно і выяўленчага мастацтва — 284-81-53
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: minsk@lim.by

Адрас у Інтэрнеце — www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ". Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.

Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва"

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку" г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79

Індэкс 63856 Наклад 2782
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 29.06.2005 у 11.00

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Выдавец: Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва"

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 766

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12